Пралетарыят БССР—фарпосту Савецкага Саюзу

Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

СЬВЯТЫНЬНЯ—А.
№ 174 (3938)
ЧАЦЬВЕР, 5 ЛЮТАГА 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

ВІТАЕ ПРАВАДЫРА ЎЗБРОЕНЫХ СІЛ ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ НАРКАМВАЕНМОРА ТАВ. ВАРАШЫЛАВА

На варце сацыялістычнай будоўлі

Нядаўна Вашынгтон узбагаціўся яшчэ адным дакументам, які сведчыць аб вялізарнейшым абвастрэньні эканамічнага крызісу ў ПАЗШ. Амэрыканскі міністар фінансаў Мэлён гэтымі днямі публічна канстатаваў гіганцкі дэфіцыт бюджэту Злучаных Штатаў.

Для Амэрыкі—адзінай капіталістычнай краіны, якая ня ведала дэфіцыту з часу сусьветнай вайны, мінулы бюджэтны год быў годам усё ўзрастаючага разпажэньня фінансавай гаспадаркі. Як заявіў Мэлён, дэфіцыт у ПАЗШ дасягнуў у гэтм годзе 370.000.000 даляраў. Вымушанае прызнаньне амэрыканскага міністра не заключае ў сабе нічога новага. Жалезныя шчупальцы глыбачэзнага эканамічнага крызісу з кожным днём усё мацней і мацней сьціскаюць горла вопата на гліняных нагах—сусьветнага капіталізму.

У апошніх нумарох «Аннэлиста» паданы надзвычай характэрныя лічбы, якія ярка малююць сёньня амэрыканскую прамысловасьць. Індэкс прамысловай актыўнасьці за сьнежань 1930 году, параўнальна з мінулымі месяцамі, рэзка панізіўся. Выплаўка чыгуну ў сьнежні 1929 г., складала 91,7, а ў сьнежні 1930 году гэта лічба панізілася да 53,5. Рэзка скарачаецца выраб сталі. Калі ў ліпені 1929 г., як паведамляе «Аннэлист», выраб сталі складаў 131,2 дык у сьнежні мінулага году выраб сталі ў ПАЗШ недзь-недзь дасягнуў 50,0. Агульны індэкс, паводле даных «Аннэлиста», параўнальна з 1929 г., у 1930 годзе зьменшыўся на 34,2. Такі-ж прамысловы паралюш ахапіў і іншыя галіны капіталістычнай гаспадаркі. Неперакор міззрнаму лепету рэнегатаў з правага лагеру, якія выхваляні «дасканалую арганізаванасьць» амэрыканскага капіталізму, крызіс у ПАЗШ узрастае з надзвычайнай стыхійнай сілай. На руінах «праспэрыці» ўсё больш і больш агаляюцца гліняныя ногі «волата» сусьветнай буржуазіі.

Нават Францыя, якой сацыял-фашысты «Форвэртс» яшчэ зусім нядаўна сьпявалі дыфірамбы, як краіне, якая «ўнікла эканамічнага крызісу», стаіць перад надыходзячай эканамічнай катастрофай. Францускі буржуазны друк з вялізарнай трывогай і глыбокім песымізмам рэгіструе жудасны рост банкрутцтваў у краіне. Ледзь «Форвэртс» у сваім новагоднім нумары скокчыў выхваляць французкі капіталізм, як Францыя стала перад фактам рэзкага скарачэньня асноўных галін індустрыі. Цяпер на матэцюрґічных прадпрыемствах Францыі ў цэлым радзе департаментаў рэзка скарочан рабочы тыдзень. Напрыклад, металістам Ліёну рабочы тыдзень скарочан у два разы. Рост бесспрацоўя ва Францыі дасягнуў максімальнай ступені.

Капіталістычны сьвет усё глыбей і глыбей заходзіць у тупік гіганцкай прамысловай дэпрэсіі, паражаны гангрэнай эканамічнага крызісу.

Толькі адна галіна прамысловасьці ў капіталістычных краінах не падпала пад колы эканамічнага крызісу, толькі адна галіна прамысловасьці ў капіталістычных краінах квітнее, гэта—ваенная індустрыя. Капіталізм шукае выхаду з тупіка ў наступленьні на пралетарыят і працоўныя масы, у шалёных узбраеньнях, якія зьяўляюцца прэлюдыяй да інтэрвэнцыі супроць краіны Саветаў, у падрыхтоўцы грамадзянскай вайны ўнутры і ў сусьветным маштабе. Цяпер, як ніколі, узрасла ваенная небясьпека. Гіганцкія посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва выклікаюць дзікую злосьць у нашых імпэрыялістычных суседзяй. Сусьветная буржуазія з трывогаю сочыць, як пралетарыят Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, бальшавіцкімі тэмпамі ажыцьцяўляе пяцігодку за чатыры гады. Са стороны буржуазных газэт зьніклі гіранічныя разважаньні аб пяцігодцы, як «фантастычным бальшавіцкім эксперыманьце». Цяпер ужо сацыял-фашысцкія «Форвэртсы» і кансэрватыўныя «Таймсы» не гавораць аб тым, што пяцігодка зьяўляецца «фантазіяй». Цяпер ужо ні адзін цьвярозы буржуазны палітык ня можа ня прызнаць гіганцкіх перамог рабочае клясы Савецкага Саюзу і яе партыі ў справе выкананьня пяцігодкі. Цяпер ні адзін сусьветнага імпэрыялізму — падрыхтоўка інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу,—клопаты аб тым, як сарваць, не дапусьціць ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў пралетарскай дзяржаве. Адсюль шалёны рост узбраеньняў, адсюль на жэнэўскіх сэсіях гапоўным пытаньнем зьяўляецца, як неасьцярожна прагаварылася газэта «Ордр»... «русская праблема».

Зьвярыная нянавісьць да СССР, які ажыцьцяўляе гістарычную праграму пабудовы сацыялізму, штурхае французкі імпэрыялізм на ўзмоцненае ўзбраеньне Польшчы, як плацдарму для інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу. Працэс «прампартыіх» выкрыў маханіку падрыхтоўкі ваеннага нападу на СССР, але пагроза інтэрвэнцыі ня толькі на зьнішчена, а яшчэ больш узрастае. Ліхаманкавае ўзбраеньне ўсіх без выключэньня капіталістычных краін, якое антысавецкі характар брыянаўскага праекту Пан-Эўропы, польска-румынскі ваенны дагавор, які быў нядаўна працягнут, «візыты» французкіх генэралаў ад інтэрвэнцыі ў Румынію і Польшчу—усё гэта зьвеньні аднаго ланцуга, імя якому шпарнал, шалёная падрыхтоўка сусьветнага імпэрыялізму да нападу на краіну Саветаў.

Бурны ўздым рэвалюцыйнага руху ў краёх капіталу, эканамічны крызіс сусьветнай капіталістычнай гаспадаркі на фоне разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе выбіваюць глебу з-пад ног імпэрыялізму. Тое, што СССР на фоне разлажэньня капіталізму ўступіў у пэрыяд сацыялізму, зьяўляецца вялізарнейшым фактарам уздыму рэвалюцыйнай актыўнасьці сусьветнага пралетарыяту. І імпэрыялізм, зразумела, будзе рабіць усё магчымае, каб перашкодзіць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву, каб сарваць выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Пралетарыят Савецкага Саюзу зараз, як ніколі, павінен узьняць сваю пільнасьць, павінен быць напагатове. На агрэсіўныя пляны францускага і польскага імпэрыялізму, на падкопы Брыянаў мы адказваем узмацненьнем бальшавіцкіх тэмпаў у справе барацьбы за сацыялізм, за ўмацаваньне абароназдольнасьці нашай краіны.

Сёньня пралетары Савецкага Саюзу і ўсяго сьвету з вялізарнай радасьцю адзначаюць 50-годзьдзе правадыра і арганізатара Чырвонай армії — Кліменція Яфрэмавіча Варашылава. Сёньня ў дзень 50-годзьдзя Кліменція Яфрэмавіча, правадыра ўзброеных сіл пралетарскай рэвалюцыі, цяжка перадаць словамі ўсю яго гіганцкую ролю, усю яго гіганцкую работу, усе яго незлічоныя заслугі перад партыяй і рабочай клясай у справе барацьбы за генэральную лінію ЦК КП(б), за сацыялізм, за ўмацаваньне абароназдольнасьці нашай краіны. Плоць ад плоці рабочае клясы, пугански сьлесар Клім Варашылаў, стойкі, непрымірымы бальшавік, непахісны барацьбіт з апартунізмам, за генэральную лінію партыі—усе свае сілы, усю сваю энэргію аддаваў і аддае справы барацьбы за ленінізм. Ад сьлесара-бальшавіка да правадыра ўзброеных сіл рэвалюцыі, да аднаго з кіраўнікоў нашай партыі — такі слаўны шлях жыцьця і барацьбы Кліменція Яфрэмавіча.

У гады падполья за ўмовах жорсткай рэакцыі тав. Варашылаў — заўсёды на пасту бальшавіка-падпольшчыка, заўсёды верны вучань і паплечнік Леніна. На фронтах грамадзянскай вайны Клім заўсёды на самых адказьнейшых пастох, на самым небясьпечным месцы. Вялікія, непераўзыдзеныя заслугі Кліменція Яфрэмавіча перад пралетарскай рэвалюцыяй. Як правадыр узброенага пралетарыяту, як арганізатар Чырвонай армії, як пралетарскі стратэг, як бальшавік, Кліменці Яфрэмавіч дасканала паказаў, як павінен жыць і змагацца сапраўдны пралетар-ленінец.

Перад тварам ваеннай небясьпекі пралетары ўсяго сьвету вітаюць Кліменція Яфрэмавіча, як правадыра і арганізатара Чырвонай армії — вернага вартаўніка заваяваньняў Кастрычніка, як непахіснага бальшавіка ленінца. Рабочыя, работніцы, калгасьнікі і адназасобнікі — беднякі і сераднякі адзначаюць 50-годзьдзе тав. Варашылава новым уздымам творчага энтузіязму, яшчэ большай мабілізацыяй сваіх сіл на барацьбу за высокія тэмпы будаўніцтва сацыялізму, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за ліквідацыю кулацтва, як класы на базе суцэльнай калектывізацыі, за ўмацаваньне абароны адзінай у сьвеце пралетарскай дзяржавы. Вітаючы правадыра ўзброеных сіл пралетарскай рэвалюцыі, пралетары Савецкага Саюзу адзначаюць гэты дзень абвяшчэньнем сваёй поўнай гатоўнасьці біцца за канчатковую перамогу сацыялізму, аб сваёй поўнай гатоўнасьці даць адпор імпэрыялістычным драпежнікам.

Вытрымаламу бальшавіку, правадыру слаўнай Чырвонай арміі—нашае пралетарскае прывітаньне

Прэзыдыум ЦВК Беларусі горача вітае вас, дарагі таварыш Варашылаў, як цьвёрдакаменнага бальшавіка-ленінца в прычыны вашага 50-годзьдзя.

Слаўны шлях рэвалюцыйнай барацьбы вашай у радох бальшавікоў за перамогу пралетарскай рэвалюцыі непарыўна зьвязан з гісторыяй стварэньня, умацаваньня і перамог Чырвонай арміі, прызнаным правадыром якое вы зьяўляецеся.

ЦВК БССР ад імя рабочай клясы і ўсіх працоўных Савецкай Беларусі ва ўрачысты дзень вашага 50-гадовага юбілею дае цьвёрдае запэўніваньне, вядучы пухільна барацьбу за перамогу сацыялізму на аснове генэральнай лініі партыі, умацоўваць пад вашым непасрэдным кіраўніцтвам абароназдольнасьць Савецкай краіны і баяздольнасьць Чырвонай арміі для таго, каб своечасова адбіць усякую спробу імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі і забясьпечыць перамогу сацыялізму ў СССР і ва ўсім сьвеце.

Няхай жыве камуністычная партыя —правадыр і авангард усіх працоўных у барацьбе за сацыялізм!

Няхай жыве ленінскі Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і яго прызнаны правадыр тав. Сталін!

Няхай жыве цьвёрдакаменны бальшавік - ленінец — правадыр Чырвонай арміі Клім Варашылаў!

Старшыня ЦВК БССР ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар ЦВК БССР ХАЦКЕВІЧ.

Наркамваенмору і старшыні Рэвваенсавету СССР т. Варашылаву

Вернаму пасьледавальніку Леніна, пралетарскаму старшыні бальшавіцкай гвардыі, правадыру і арганізатару ўзброеных сіл пралетарскай дыктатуры — Кліму Яфрэмавічу Варашылаву ад імя працоўных арганізацый, байцоў і начскладу акругі — шчырае баявое прывітаньне.

50-гадзьдзе любімага правадыра Чырвонай арміі ўздымае новую хвалю сацыялістычнага энтузіязму байцоў і начскладу ў справе выкананьня загаду наркома на баявой падрыхтоўцы.

Знаходзячыся на варце заходніх межаў краіны Саветаў, воінскі акругі у цесным адзінстві з працоўнымі БССР, Бах. вобласьці і усяго Саюзу гатовы ў любы момант адбіць напад імпэрыялістаў і змагацца за краіну, якая ўступіла ў пэрыяд сацыялізму, змагацца з усім упэўненьнем пам запалом, за усёй жорсткай сілай 150 мільёнаў свабодных народаў.

Рэвваенсавет БВА.

Кепрымірымы вораг самаўладзтва і буржуазнага ладу З дакумантаў царскай ахранкі аб тав. Варашылаву

МАСКВА, 4. У музэі Цэнтральнага Дому Чырвонай арміі захоўваецца дакумант, які адносіцца да эпохі прабываньня тав. Варашылава ў сылцы ў Архангельскай губерні. Дакумант прадстаўляе сабою - выпіску з сакрэтнай справы архангельскага губарнатара. Непрымірымы вораг самаўладзтва і буржуазнага ладу, тав. Варашылаў, нават у палоне, селячы за замкамі царскай турмы, бязупынна жыцьцяў на барацьбу і, кажучы словамі дакуманту, «распальваў палітычныя «страсці». Ніжэй падаем тэкст гэтага дакуманту:

Весткі аб пранстаўляемым да адміністрацыйнай высылкі, які знаходзіцца пад наглядам паліцыі ў гор. Хапмагорах сепаніе Кліменцыю Яфрэмаву Варашылаву

ВАРАШЫЛАЎ КЛІМЕНЦІ ЯФРЭМАЎ — сепаніе Хэрнаўскай губ., Старабельскага павету, Вароўскай волясьці і спадары. Нежанаты. Узрост 30 год. Зроблены пры Архангельскім губ. жандарскім кіраўніцтве, у парадку правіл аб дзяржаўнай ахоране, сьледзтвам устаноўлена, што Кліменці Яфрэмаў Варашылаў выслан пад нагляд паліцыі ў Архангельскую губэрнію за рэвалюцыйную дзейнасьць і падбухтораньне рабочых да забастоўкі. Да высылкі ў Архангельскую губэрнію Варашылаў, будучы на пасадзе сьлесара машынна - будаўнічага заводу Гартмана у гор. Луганску, распальваў у рабочым асяродзьдзі «страсці», кіраваў забастоўкамі на заводзе і, займаючы пасаду старшыні прафсыялкнага таварыства рабочых Гарманскага заводу, стараўся падбухтаваць рабочых да ўсьведамленьня сацыял-дэмакратычных ідэй, за што быў арыштаваны і высланы пад нагляд паліцыі ў Архангельскую губэрнію на тры гады, тэрмін нагляду скончыць 28-га ліпеня 1911 г. Варашылаў, знаходзячыся ў гэтай справе пад вартай у Архангельскай губэрскай турме, стараўся падкрэсьліць усю важнасьць пытаньняў вучэньня ў справе посьпіховага выкананьня вялікіх плянаў.

Выпрабаванаму змагару за Кастрычнік, вернаму вучню Леніна, правадыру слаўнай Чырвонай арміі—гарачае пралетарскае прывітаньне

Наркамваенмору і старшыні РВС СССР тав. К. Я. ВАРАШЫЛАВУ

У дзень вашага 50-цігодзьдзя шлем бальшавіцкае прывітаньне ад імя КП(б)Б і працоўных Савецкай Беларусі.

Вітаем вас, як праверанага вучня і паплечніка Леніна, стойкага барацьбіта за справу пралетарыяту і правадыра пераможнай Чырвонай арміі, якія пры вашым актыўным бацьбіцтве удзеле вызваліла Савецкую Беларусь ад банд міжнароднага імпэрыялізму. Бальшавікі Беларускай рэспублікі—фарпосту Савецкага Саюзу — з асаблівай увагай адносяцца да справы абароны краіны і ў патрэбны момант гатовы біцца на перадавых пазыцыях пад вашым баявым выпрабаваным кіраўніцтвам.

ЦК КП(б)Б ГЕЙ.

Савет Народных Камісараў БССР ад імя працоўных Беларусі ў дзень вашага 50-цігодзьдзя шле вам горачае пралетарскае прывітаньне, як выпрабаванаму змагару за Кастрычніцкія завяваньні, вернаму вучню Леніна, правадыру слаўнай Чырвонай арміі.

Працоўныя Савецкай Беларусі, якія перанесьлі цяжкае прыгнечаньне, вызвані і натаваньні з боку белагвардзейскіх банд і беларускіх акупантаў, з асаблівай увагай адносяцца да справы падрыхтоўкі нашай краіны да абароны, з асаблівай любасьцю гладзяць на Чырвоную армію, вызваліўшую Савецкую Беларусь, пры вашым непасрэдным баявым удзеле, ад беларускіх акупантаў і даўшую тэтым самым магчымасьць з посьпехам працягваць сацыялістычнае будаўніцтва.

Савет Народных Камісараў БССР запэўнівае вас, што калі буржуазія паспрабуе парушыць нашы межы і мірную працу, рабочая класа, калгасьнікі і адзіняцка-серадняцкае сялянства Савецкай Беларусі, якія жывуць на руінах двох сьветаў, са зброяй у руках, пад выпрабаваным кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і яе ленінскага Цэнтральнага Камітэту, стануць на перадавыя пазыцыі для абароны Кастрычніцкіх завяваньняў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР — ГАЛАДЗЕД.

Наркамваенмору т. Варашылаву

Рабочыя, служачыя і чырвонаармейцы, сабраўшыся на перавыбары гарадзкога савету, шлюць вам гарачае пралетарскае прывітаньне ў дні 50-ай гадавіны вашага нараджэньня.

Жадаем вам, дарагі наш юбіляр, посьпехаў у вырашэньні задач абароны СССР і асабліва на ўмацаваньні радоў рабоча-сялянскай Чырвонай арміі і флёту і запэўніваем, што ў хвіліну нападу капіталістаў і фашыстаў на краіну пралетарскай дыктатуры пралетары і працоўныя масы Менску і ўсёй БССР стануць, як адзін, на абарону завяваньняў Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Агульны сход аднагалосна выбраў вас пачэсным членам Менскага гарадзкога савету.

Няхай жыве Чырвоная армія і флёт і яе старэйшы камандзір Клім Варашылаў!

Няхай жыве кампартыя—кіраўнік усяго сацыялістычнага будаўніцтва і правадыр Чырвонай арміі!

Няхай жыве рулявы ленінец—тав. Сталін!

Прэзыдыум сходу: ХАЦКЕВІЧ, ПРЕШАКОЎ, ХАНІН.

Тав. Варашылаву ад школы К-скага чырвонасьцяжнага

Стойкаму бальшавіку - ленінцу, лепшаму ўдарніку Чырвонай арміі—тав. Варашылаву ў дзень 50-гадовага юбілею—гарачае баявое чырвонаармейскае прывітаньне ад курсантаў палкавой школы К-скага чырвонасьцяжнага палка.

Сьвяткуючы 50-цігадовы юбілей свайго любімага правадыра, мы яшчэ з большым энтузіязмам і энэргіяй возьмемся за ўдарную работу на ўзмацненьні баяздольнасьці арміі. Зь сваіх пешых ударнікаў перадаем ва ўдарную брыгаду вашага імя, якія даюць свае пралетарскае слова ўдарніка-варашылаўца скончыць школу да выхаду ў лягеры.

20 ударнікаў, пакінуўшых на справе ударным тэмпы баявой падрыхтоўкі, перадаем у стаёвую ленінскую партыю.

Складаем фонд рацыяналізатарскіх прапаноў вашага імя, узмацняючы тэмпы баявой падрыхтоўкі.

Няхай жыве Чырвоная армія, заўсёды гатовая даць рашучы адпор катам сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі!

Няхай жыве авангард пралетарскай рэвалюцыі—стаёвая камуністычная партыя і яе ленінскі ЦК!

Няхай жыве правадыр непераможнай Чырвонай арміі, сапраўдны бальшавік ленінец—тав. Варашылаў!

Французкі імпэрыялізм кідае мільярды на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР

Адкрыты заклін да нападу на СССР

ВЭНА, 3. У цэнтральным органе пан-эўрапейскага саюзу «Цэйтшрыфт» апублікавая артыкул старшыні гэтага саюзу Кудэнгава-Калергі: «Якія нашы абавязкі да Савецкага Саюзу? Пярэчні супроць прыняцьця СССР у пан-Эўропу, Кідэнгаў піша:

«Эўрапейская палітыка павінна лічыцца з магчымасьцю таго, што бальшавізм у Расіі затрымаецца і правалае, хаця-б часткова, сваю вялізарную эканамічную праграму. Калі гэта ўдасьць, дык непадрыхтаваная Эўропа стане тварам у твар з мацнейшай эканамічнай дзяржавай нашай плянеты. Барацьба з савецкай прапагандай, аб'ядноньне эўрапейскага замежнага гандлю перш за ўсё супроць Расіі зьяўляюцца мыцьцёвымі пытаньнямі для Эўропы».

У заключэньне аўтар артыкулу заклікае капіталістычную Эўропу спарычаць цяперашнюю перадышку, калі яшчэ ня прыходзіцца бояцца нападу Расіі, бо апошняя запята сваім унутраным будаўніцтвам.

Мільярдныя пазыкі наўзбраеньні васалаў

РЫМ, 3. Як паведамляе парыскі карэспандэнт «Стампа», французкі ўрад згадзіўся на рэалізацыю ва Францыі ПОЛЬСКАЙ ПАЗЫКІ У РАЗЬМЕРЫ І МІЛЬЯРДА ФРАНКАЎ. Паводле слоў карэспандэнта, гэта пазыка будзе першай у сэрыі палітычных пазык, якія Францыя мае намер даць сваім цэнтральна- і ўсходня - эўрапейскім саюзьнікам. Сьведам за рэалізацыяй польскай пазыкі БУДЗЕ ВЫПУШЧАНА РУМЫНСКАЯ ПАЗЫКА Ў 2 МІЛЬЯРДЫ ФРАНКАЎ. Адначасова буйная пазыка будзе дана і ЮГАСЛАВІІ. Газэта заяўляе, што трэшы, атрыманыя дзякуючы гэтым пазыкам, будуць выдаткаваны на ваенныя патрэбы, згодна польска-румынскага ваеннага дагавору.

Атака Дэтэрдынга на савецкую нафту

БЭРЛІН, 3. Заўтрашняга дня сусьветныя нафтавыя канцэрны паніжаюць цэны на бэнзіну ў Нямеччыне на 2 пфэніґі. Будучы вытрыманы ацэн на бэнзоль і на газалін. Апрача таго гетыя фірмы будуць даваць пакупцом-прадпрыемствам яшчэ дадатковую скідку ў два пфэніґі, зе літар. Гэта паніжэньне цэн мае на мэце прымусіць савецка - нямецкае нафтавае т-ва прыняць умовы, якія прапануюцца сусьветнымі фірмамі. Цікава, што гэта паніжэньне цэн абвяшчаецца непасрэдна пасьля знаходжаньня Дэтэрдынга ў Нямеччыне.

Пабудова грандыёзнага ваеннага заводу ў Румыніі

РЫМ, 3. Згодна паведамленьня з Бухарэсту, РУМЫНІЯ ЗАКЛЮЧЫЛА З ФІРМАЙ ШКОДА (якая ўпадае ваеннымі заводамі ў Чэхо-Славакіі) ДАГАВОР, на падставе якога фірма АБСТАЛЮЕ КАЛЯ РУМЫНСКАЙ СТАЛІЦЫ ГРАНДЫЁЗНЫ ЗАВОД ВЫБУХОВЫХ МАТЭРЫЙ І ВАЕННЫХ ПРЫПАСАЎ. У будаўніцтве прыме таксама ўдзел французкая фірма ваенных заводаў ШНЭЙДЭР-КРЭЗО.

Адкрыты ліст да Максіма Горкага

Глыбокапаважаны і дарагі Аляксей Максімавіч!

Вашы [illegible] у юбілейны краіны пралетарскай дыктатуры выклікалі прыступы абурэньня ў асаблівічы эўрапейскай буржуазіі і яе прыхлыскачаў.

Буржуазная і сацыял - фашысцкая праса шкуе вас са старанасьцю, якая прымушае ўспомніць жаданьне, што ўжэсь час было да вас з боку новачасаўцаў. Буржуазія ня можа дараваць вам таго, што ў дні, калі ў Маскве пралетарскі суд судзіў агентаў сусьветнай контр - рэвалюцыі, па ўсім сьвеце прагучэў голас абурэньня вялікага мастака, які выкрываў злачынную кучку шкоднікаў і тых, што пазбухторвалі іх.

Буржуазія ня можа дараваць вам таго, што ў дні, калі падпальшчыкі новае сусьветнае вайны усялякімі шляхамі і сродкамі правакавалі разгром рэспублікі працы, вы папярэдзілі рабочых і сялян аб вызьлізваючых пасыўных адносінах да гэй крывавай гульні, якую зноў задумвае banda драпежнікаў, прыкрываючых жыцьцё грабежніцтвам рабочае працы. Буржуазія ня можа дараваць вам, што ў той час, калі сантыментальныя гуманісты, якія прыслужваюць капіталістычным людаедам, лілі кракадзілавыя сьлёзы з нагоды «бальшавіцкіх зьверстваў», рабочая клясa Савецкага Саюзу пачула вашыя, жорсткія і мужныя словы «калі вораг не здаецца—яго зьнішчаюць...»

І таму агрэсіўная сьлінай наміраючай клясы пырскаюць на вас бульварныя газэтчыкі са старонак буржуазных газэт.

Навуковыя работнікі БССР з пачуцьцём глыбокага абурэньня ганьбяць арганізатараў і натхняльнікаў згіднага цкаваньня, аб'ектам якога зьяўляецца ленінец савецкі пісьменьнік, нястомны змагар супроць ладу эксплёатацыі чалавека чалавекам.

Мы лічым неабходным паслаць вам у гэтыя дні брацкае таварыскае прывітаньне ад імя навуковых работнікаў адной з рэспублік Савецкага Саюзу — Савецкая Беларусь у гады царызму, адна з найчэмных акраін расійскай імперыі, — цяпер упарта і настойліва будуе на самым рубяжы імпэрыялістычнага свету сацыялізм.

Рукаў аб руку з гэрайчаю рабочаю клясаю, пад непасрэдным кіраўніцтвам ленінскае партыі, тысячы навуковых работнікаў БССР, работнікаў, народжаных рэвалюцыяй 12 вышэйшых навучальных устаноў і 17 навукова - даследчых інстытутаў, прымаюць удзел у стварэньні беларускае сацыялістычнае культуры.

Гэтыя навуковыя работнікі лічаць сваім абавязкам выказаць вам пачуцьцё глыбокай сымпатыі і салідарнасьці.

Толькі сёньня прачыталі мы надзвычайныя радкі вашага лісту сяпрэхоўскім рабфакаўцам. У гэтым лісьце вы паказалі, як адзічэлая буржуазія імкнецца прыціснуць навуку, адхапіць рэлігію і містыку.

Няхай-жа гэта ажыцьцяе буржуазія шкуе вас,—мы упэўнены, што гэта не перашкодзіць вам. Прыхільнік рабочае клясы, ведае, што калі шкуюць клясавыя ворагі рабочае клясы, дык гэта значыць, што ён добра служыць пралетарскай справе.

Працягвайце-ж, таварыш Максім Горкі, сваю слаўную службу краіне, у якой будуецца сацыялізм. Будзьце прыкладам таго, як работнік навукі, работнік культуры, работнік настаўніцкага слова, павінен адлавець ясце сусьветна-гістарычнай справе сусьветнай сацыялістычнай рэвалюцыі.

З Беларусі, якая нядаўна яшчэ была сярмяжна - лапцюжнай краінай саламяных хат і млетачак «чэрты», непераможная воляй пралетарскай рэвалюцыі перагвараецца ў індустрыяльна - аграрную Савецкую Сацыялістычную рэспубліку, шлем мы вам. Аляксей Максімавіч, брацкае прывітаньне і моцнае таварыскае пацісканьне рукі

Старшыня сэкцыі навуковых работнікаў БССР
С. Я. ВАЛЬФСОН.
Адказны сакратар
ПРАКАПЧУК.

Жудасныя факты катаваньняў у Луцку

пацьвярджаюцца нават фашысцкім друкам

ВАРШАВА, 3. Орган «Аналыцынай дэмакратычнай мысьлі» ўнутры краіны блёку «Пшэлом» прысьвячае натаваньням у Луцкай турме артыкул пад загалоўкам: «Чорная старонка». Вытрымкі з артыкулу «Пшэлому» перадрукоўваюць сёньня рад газэт. Вядомы «Фольксцайтунг» падкрэсьлівае, што артыкул «Пшэлому» пацьвярджае жудасныя факты Луцку, што луцкая справа не зьяўляецца «выдумкай антыдзяржаўных элемэнтаў». «Наколькі, — піша «Фольксцайтунг» — павінен быць чорны гэты луцкі разьдзел, калі нават некаторыя з пісьдучыкаў спазохаліся яго».

Выступленьне т. Грынько

Наркамфін СССР тав. Грыньке выступіў у клюбе работнікаў народнай гаспадаркі імя Дзяржынскага з дакладам аб задачах, пастаўленых фінпланам бягучага году перад гаспадарнікамі.

— Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК і сэсія ЦВК СССР рэзка завастрылі ўвагу ўсёй краіны на фінансавым плане бягучага году.

Бягучы год характарызуецца рэзкім узмацненьнем тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва ў параўнаньні з першымі двума гадамі пяцігодкі і першапачатковымі намячэньнямі яе. Гэта акалічнасьць рэзка ставіць пытаньне аб узмацненьні накапленьня ў краіне, бо ў нас няма іншай крыніцы сродкаў для сацыялістычнага будаўніцтва.

З усёй сумы фінпляну 1931 г. у 32 млрд. руб. 13,3 млрд. складаюць накапленьні агрэмаднанага сэктару, 11 млрд. руб. — падаткі, 3,8 млрд. руб. — прыцягнутыя сродкі насельніцтва, 2,5 млрд. руб. — сродкі сапстраху і дзяржстраху. Прырост фінпляну 1931 г. у параўнаньні з 1929-30 годам абсалютна вызначаецца ў 10 млрд. руб., з іх 5 млрд. руб. абумоўліваюцца колькасным ростам народнай гаспадаркі, 3 млрд. руб. — зьніжэньнем сабекошту ў прамысловасьці, транспарце, гаравазвароце і г. д. і 2 млрд. руб. — новымі мерапрыемствамі (напрыклад, адназовы збор). Такім чынам, фінплян бягучага году зьяўляецца плянам вялізарнага колькаснага росту, плянам сацыялістычнай рацыяналізацыі народнай гаспадаркі і, нарэшце, плянам мабілізацыі народных рэсурсаў у форме абавязковых і добраахвотных плацяжоў. Фінплян 1931 г. будуецца без эмісіі. Гаспадарнікі павінны ўсьвядоміць, што іх чакае вельмі суровы фінансавы рэжым.

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК падкрэсьліў неабходнасьць пастаўць выдаткі кожнай арганізацыі ў простую залежнасьць ад выкананьня ёю сваіх прамфінпляноў.

Дэкрэт аб крадытнай рэформе пакінем пакажыць канец аўтаматызму крэдытаваньня. Сьляпое фінансаваньне гаспадарчага органу на будзе мець месца.

Грэба каляндарна мяркаваць. Мы павінны у першым-за квартале пакапіць рэзервы для таго, каб забясьпечыць фінансаваньне капітальнага будаўніцтва і загатовак па працягу наступных кварталаў.

У заключным слове тав. Грыньке падкрэсьліў усю важнасьць пытаньняў вучэньня у справе посьпіховага выкананьня вялікіх плянаў.

У фонд дырыжаблябудаўніцтва

— Рабочыя і служачыя групкому № 2 мылкаэлэрацыі у адказ інтэрвэнтам — радпальшчыкам вайны ўносяць на пабудову самалёта «Камунальнік СССР» 490 руб. і выклікаюць рабочых і служачых мылкаэлэрацыі і групкому № 1.

— Агульны сход жыхароў 76-кватэрнага дому па Масковскай вул. № 24 пастанавіў правесьці збор сродкаў на пабудову дырыжабля імя Варашылава і адначасова паслаць выклік 73-кватэрнаму дому па Унівэрсытэцкай вуліцы. На 1 лютага жыхарамі 76-кватэр. дому сабрана ўжо 80 руб. Сродкі выбіраюцца далей.

— Працоўнае сялянства вёсак Крэмавічы, Шыпінцы, Вялікае поле, Гарадзенча, Паддуб'е, Грабяні, Бярозкаўскага сельсавету, у адказ інтэрвэнтам пастанавілі адлічваць адзін дзень на лесанывазках у фонд абароны краіны. Суботнія даў 200 руб.

Выклікаюцца ўсе іншыя вёскі Бярозкаўскага сельсавету, Бягомльскага раёну.

— Асьветнікі Каралінчыны пастанавілі адлічыць аднадзенны заработак у фонд дырыжаблябудаўніцтва і выклікаюць усіх асьветнікаў БССР.

— Супрацоўнікі Аршанскай міліцыі і крымвышуку, каб актыўна дапамагчы дырыжаблябудаўніцтву, уносяць: т. Іванову — 5 руб., Кручкоў — 3 руб., Панфіловіч — 3 руб., Шынікаў, Трапашко і інш. уносяць па 2 руб. Усе гэтыя таварышы выклікаюць рэшту супрацоўнікаў міліцыі і крымвышуку.

— Калгасьнікі Бялынічскага раёну з гонар вёсьцы сельсавету свайго раёну ўносяць 160 пудоў збожжа на пабудову дырыжабля.

Рабочымі-ж і грамадзянамі арганізацыямі раёну ў падарунак вёсьцы ўнесена на пабудову дырыжабля [illegible] руб.

Музычны разьдзел 5-га кавпайнага палка ўносіць у фонд пабудовы дырыжабля «Клім Варашылаў» 250 руб. і выклікае ўсе аркестры Самарскай кав. дывізіі і палка АДПУ.

КОРБУТ.

Дашкольнікі, дзеці рабочых «Вагжановкі» арганізавалі збор сродкаў на самалёт «Октябрэнок».

Пленум Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі ВК(б)Б склікаецца на 15 ЛЮТАГА г. г.

ЦК КП(б)Б.

Двухдэкаднік штурму прарываў у ільназагатоўках

У бальшавіцкі бой за кожнае кілё ільну

Не дамо апартуністам і шкоднікам затармазіць работу нашай тэкстыльнай прамысловасьці. Спагнаць лён з кулацка заможных гаспадарак

Разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод бядняцка-серадняцкіх мас, дабіцца ў парадку самаабавязацельстваў поўнага выкананьня плянаў ільназагатовак

Узяць лён!

Чаму зрываюцца пляны загатовак ільну, капапель і ільняного сена?

На гэта пытаньне прэзыдыум ЦКК КП(б)Б даў вусім выразны адказ: справа ня ў тым, што няма ільну. Лён ёсьць, але загатоўчыя арганізацыі ня ўмеюць яго браць.

На 25-1 замест таго, каб у асноўным закончыць загатоўку ільну, мы загатовілі толькі 25 проц. ільну, а па каноплях — толькі 8 проц. Гэтыя лічбы зьяўляюцца ганебнай плямай на дзейнасьці загатоўчых арганізацый. Загатоўчыя арганізацыі нават ня здолелі спагнаць лён ад кантрактоўшчыкаў, якія заключылі цьвёрдыя ўмовы з аддаваньня на здачу ёй ільну. З 2.500 тон ільну, якія павінны былі здаць кантрактоўшчыкі, загатоўлена толькі 1.213 тон.

Паказаўшы апартуністычную мяккацелясьць у адносінах да спагнаньня ільну ад кантрактоўшчыкаў, раённыя арганізацыі правялі махровы апартунізм у справе давядзеньня цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак. У выніку кулацка-заможныя гаспадаркі замест 4-5 тысяч тон ільну, здалі толькі 1.000 тон.

Па дырэктыве ЦК і СНК яшчэ 10 сьнежня павінны былі быць спагнаны цьвёрдыя заданьні з кулакоў. Раённыя арганізацыі ня судзілі кулакоў-сабатажнікаў, якія ня здалі ільну, ня прымусілі іх жорсткімі штрафамі выконваць распараджэньні савецкага ўраду. Некаторыя раённыя арганізацыі нават ня маюць уліку даных кулаком цьвёрдых заданьняў. Прэзыдыум ЦКК кваліфікуе невыкананьне дырэктывы ўраду і ЦК партыі аб дачы вестак на давядзеньні цьвёрдых заданьняў да кулака і заможніка, як яўную правую практыку. Факт няпрысылкі вестак аб дачы цьвёрдых заданьняў і ступені іх выкананьня кулакамі і заможнікамі азначае, што раённыя кіруючыя арганізацыі ня цікавіліся правядзеньнем важнейшай дырэктывы партыі аб узмацненьні націску на кулака, клясавага ворага, які зрывае насьпяховае выкананьне плянаў ільназагатовак.

Прэзыдыум ЦКК перадаў сакратароў райкомаў і старшынь РВК у партканферэнцыю для прыняцьця рашучых мер па партыйнай лініі ў адносінах да гэтых таварышоў. Гэта пастанова прэзыдыуму ЦКК павінна быць рашучым папярджаньнем для ўсіх тых, хто па-апартуністычнаму і па-бюракратычнаму адносіцца да дырэктыў вышэйшых органаў па ільназагатоўках.

Партыя будзе самым жорсткім чынам рэагаваць на праяву апартунізму на ільназагатоўчым фронце.

Ня даўшы бальшавіцкага адпору кулаку-сабатажніку, рад раённых арганізацый ня здолелі арганізаваць бядняцка-серадняцкія і калгасныя масы на выкананьне плянаў ільназагатовак. Раённыя арганізацыі не кіравалі справай самаабавязацельстваў, у гэтай галіне існавала апартуністычная арыентацыя на самацёк. Ніякай растлумачальнай работы сярод беднаты, ніякай арганізацыйнай работы ў калгасах не вялося. Таму пляны загатовак у калгасах і ў бядняцка-серадняцкіх гаспадарках значна адстаюць.

Час пакончыць з бязьдзейнасьцю. Не дамо апартуністам і шкоднікам затармазіць работу нашай тэкстыльнай прамысловасьці.

Прэзыдыум ЦКК прыняў рад жорсткіх пастаноў адносна ільназагатовак. Прэзыдыум ЦКК рашыў арганізаваць супольна з друкам, пракуратурай, прафсаюзамі, камсамолам і кааперацыйнымі арганізацыямі двухдэкаднік штурму прарываў у ільназагатоўках.

У бальшавіцкі бой за кожнае кілё ільну—вось задача гэтага двухдэкадніка.

Удзельнікі двухдэкадніка павінны мабілізаваць лепшыя сілы ў атаку за лён. Камсамол, прафсаюзы, у асаблівасьці тэкстыльшчыкі і с.-г. рабочыя павінны быць пачынальнікамі ў гэтай справе.

Аказваючы практычную дапамогу сельсаветам, калгасам у выкананьні пляну ільназагатовак, мы павінны адначасова выкарыстаць усе вагары, якія знаходзяцца ў распараджэньні органаў дыктатуры пралетарыяту для выгнаньня з раённага і цэнтральнага апарату ўсіх апартуністаў і шкоднікаў, якія перашкаджаюць выкананьню ільназагатовак.

Засталіся лічаныя дні. Нельга больш гаварыць «наогул» аб правай практыцы ў ільназагатоўках. Трэба ганьбіць канкретных носьбітаў гэтай правай практыкі.

Таму пралетарская грамадзкасьць з поўным правам можа заявіць кіраўніком рённых арганізацый—Ляпаў, Жлобіну, Расонаў, Клічаеў і Віцебску: ганьба вам, апартуністам, ня здолеўшым па-бальшавіцку ўзяць лён.

Вярэце прыклад з кіраўнікоў Лёзьнянскай, Дрысенскай і іншых арганізацый, якія ўжо наблізіліся да 100-процантнага выкананьня пляну ільназагатовак.

І. ВЕРБА.

Загатоўкі ільну—на ўдарны тэмп

ДА 25 ЛЮТАГА—ВЫКАНАЦЬ ГАДАВЫ ПЛЯН

(З пастановы прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б)

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б па сваім паседжэньні ад 2-га лютага заслухаў даклад аб ходзе ільназагатовак па БССР.

Ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы партыі і ўраду, плян ільназагатовак фактычна сарваны. Раённыя арганізацыі да гэтага часу не давялі цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак. Прэзыдыум ЦКК адзначае, што сабатаж кулацка-заможных гаспадарак на сустрэч з боку раду раённых арганізацый бальшэвіцкага адпору. Да суда была працягнута зусім незначная колькасьць гаспадарак. Штрафы, якія ўскладаліся на кулакоў, вельмі мізэрныя.

У выніку кулацка-заможныя гаспадаркі замест 4,5—5 тыс. тон, здалі толькі 1 тыс. тон ільназапакна.

Прэзыдыум ЦКК адзначае, што раённыя арганізацыі правялі апартунізм на практыцы пры спагнаньні ільну з кантрактоўшчыкаў. Злосныя парушэньні кантрактацыйных дагавораў ня былі прыцягнуты да судовай адказнасьці. Замест 2.500 тон кантрактанты здалі толькі 1.213 тон.

У выніку калгасы замест 4 тыс. тон ільну здалі толькі 1 тыс. тон.

Прэзыдыум ЦКК адзначае, што рад раённаў замест арганізацыі бядняцка-серадняцкіх мас супроць кулацкага сабатажу, замест шырокага ахопу беднякоў і сераднякоў самаабавязацельствамі, правялі злачынную бязьдзейнасьць. Сярод беднаты не вялося ніякай масавараслумачальнай работы.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б пастанавіў:

У мэтах пераключэньня ільназагатовак на бальшавіцкія тэмпы арганізаваць з 5-га лютага двухдэкаднік штурму прарываў у ільназагатоўках. У арганізацыі двухдэкадніка павінны прыняць удзел органы ЦКК-РСІ, раённыя парт-арганізацыі, прафсаюзы, камсамол, газэты «Зьвязда», «Савецкая Беларусь», «Беларуская вёска» і «Чырвоная зьмена», органы пракуратуры і суда, а таксама загатоўчыя арганізацыі і Наркамгандлю.

Двухдэкаднік павінен быць праведзен пад такім кутом погляду, каб да 25-га лютага скончыць гадавы плян загатовак ільну.

Раённыя апараты, КК-РСІ, пракуратуры, суда, Наркамгандлю і РВК павінны быць мабілізаваны на 5 дзён для праверкі становішча ільназагатовак па ўсіх сельсаветах, выяўленьня вінаватых у недавядзеньні цьвёрдых заданьняў да кулацкіх гаспадарак і зрыве плянаў. Тут-жа на месцы павінны быць арганізаваны паказальныя суды над кулакамі і заможнікамі, якія сабатуюць ільназагатоўкі, над злоснымі парушэльнікамі кантрактацыйных дагавораў і над працаўнікамі сельсаветаў, якія ігнаруюць дырэктывы ўраду.

Неабходна мабілізаваць калгасныя масы на ўдарную апрацоўку ільну і выкананьне на працягу двухдэкадніка плянаў ільназагатовак як калгасамі, так і бядняцка - серадняцкімі масамі вёскі, арганізуючы сацыялістычнае спаборніцтва паміж паасобнымі калгасамі і вёскамі.

Пракурору рэспублікі даручаецца на працягу двух дзён камандыраваць у Жлобінскі, Клічаўскі, Ляднянскі і Расонскі раёны адказных работнікаў пракуратуры на выяўленьне вінаватых у ігнараваньні партыйных і ўрадавых дырэктыў па ільназагатоўках. Расьсьледаваньне ў гэтых раёнах павінна быць скончана не пазьней 8-га лютага.

Парткалегіі—перадаць справы аб сакратарох райкомаў і старшынях РВК на ступных раёнаў: Круглянскага, Прапойскага, Сьмілавіцкага, Хойніцкага і Чэрскага, якія, ня гледзячы на катэгарычныя прапановы ЦК і СНК, дагэтуль не паведамілі Наркамгандлю аб колькасьці кулацка-заможных гаспадарак, ахопленых цьвёрдымі заданьнямі, і ходзе іх выкананьня. Гэтыя справы пайпны быць разгледжаны на працягу 5 дзён.

Наркамгандлю і Белкаапсаюзу запрапанавана прэміяваць здатчыкаў ільну, як правіла, выключна мануфактурай, павялічыўшы спэцыяльна для гэтай мэты фонды прэміяваньня і вызначыўшы нормы прэміяваньня па сэктарох.

Калгасцэнтру прапанавана на працягу двух дзён устанавіць сумесна з Белкаапсаюзам нормы і мэтады прэміяваньня калгасьнікаў і рабочых саўгасаў, якія займаюцца апрацоўкай ільну, дэфіцытнымі таварамі.

Калгасцэнтр шляхам раду мерапрыемстваў (перавод на зьдзельшчыну, арганізацыя ўдарніцтва) павінен забясьпечыць апрацоўку ільну ў найбольш хуткія тэрміны.

Прэзыдыум ЦКК лічыць зусім недапушчальнымі спрочкі паміж Калгасцэнтрам, НКЗемам і Галоўленкомам адносна матэрыяльнасьці выкананьня дырэктыў СНК па вываазе ільняной саломы з калгасаў на склады прыёмачных арганізацый.

Прэзыдыум ЦКК прапануе Калгасцэнтру і Галоўленкому над асабістую адказнасьць кіраўнікоў гэтых арганізацый на працягу двух дзён забясьпечыць вываз ільняной саломы з калгасаў. Калгасцэнтру сумесна з упаўнаважанымі Наркамату Шляхоў Зносін на працягу двух дзён канчаткова вырашыць пытаньне аб чыгуначным тарыфе.

Прэзыдыум ЦКК канстатаваў пасьўнасьць камсамольскіх арганізацый і слабую работу прафсаюзаў, асабліва саюзаў сельгасрабочых і тэкстыльшчыкаў у справе ільназагатовак.

Прэзыдыум пастанавіў паставіць перад ЦК ЛКСМ і фракцыяй ЦСПСБ гэта пытаньне з тым, каб стварыць сапраўды пералом у рабоце гэтых арганізацый у ільназагатоўках, у прыватнасьці ў правядзеньні двухдэкадніка.

60 проц. спэцыялістаў—у раёны

50 ПРОЦ. КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ У РАЁНАХ МТС

Пастанова калегіі Наркамзему

Заслухаўшы інфармацыю пасеўбюро і ўпаўнаважаных Наркамзему па праверцы ходу падрыхтоўкі да веснавой с.-г. кампаніі — калегія Наркамзему адзначае:

1) Што работа па ўцягненьні ў калгасы бядняцка - серадняцкіх гаспадарак цэлым радам раёнаў яшчэ да гэтага часу ня ўвязана з правядзімымі гаспадарча - палітычнымі кампаніямі, што ставіць пад пагрозу выкананьне ў тэрмін пастаноў студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб процанце калектывізацыі.

2) Пытаньне арганізацыі насенных і страхавых фондаў у раёнах і асабліва загатоўка насеньня дэфіцытных культур не пастаўлена ў цэнтры ўвагі работы раённых арганізацый, прычым гэта работа разьлічана на самацёк і замест мабілізацыі насенных фондаў на мясцох разьлічваюць на завоз з боку.

3) Збожжаачыстка, рамонт інвэнтару праводзяцца абсалютна нездавальняючэ, прычым большая частка раёнаў ня ведаюць аб тым, што робіцца па пытаньнях правядзеньня збожжаачысткі і рамонту с.-г. інвэнтару і трактараў. Гэта ўжо ставіць пад пагрозу зрыву мерапрыемствы па збожжаачыстцы і своечасовай падрыхтоўцы інвэнтару.

4) Падрыхтоўка кадраў масавай кваліфікацыі яшчэ дагэтуль не пастаўлена ў цэнтры ўвагі саўгастрэстаў, калгаснакаапэрацыйнай сыстэмы, Трактарацэнтру і раённых зямельных арганізацый, што ставіць пад пагрозу выкананьне пляну падрыхтоўкі кадраў для арганізацыі сельска - гаспадарчай вытворчасьці ў саўгасах, калгасах і МТС.

Выходзячы з такога становішча па падрыхтоўцы да веснавой с.-г. кампаніі, калегія Народнага Камісарыяту Зямляробства пастанаўляе:

1) Паставіць, як задачу, перад раённымі арганізацыямі — ДАВЕСЬЦІ ПРОЦАНТ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ДА ВЯСНЫ У РАЁНАХ РАЗГОРТВАНЬНЯ МТС ДА 50, аб чым увайсьці з хадайніцтвам у адпаведныя ўрадавыя і дырэктыўныя арганізацыі.

2) У выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б не пазьней 10-II г. г. мабілізаваць ня менш 60 проц. спэцыялістаў, працуючых у гарадох, і паслаць у раёны для практычнай дапамогі машына - трактарным станцыям, саўгасам, калгасам і сельсаветам па правядзеньні веснавой с.-г. кампаніі.

3) Абавязаць дырэктараў трастаў, кіраўнікоў трастаў, кіраўнікоў цэнтральных калгасна - кааперацыйных арганізацый, райзэ, райкалгассаюзаў і кааперсаюзу пераключыць работу па правядзеньні веснавой с.-г. кампаніі на баявыя тэмпы, забясьпечыўшы пры гэтым выкананьне заданьняў па ўстаноўленым Урадам і партыяй тэрміны.

4) За слабую падрыхтоўку да веснавой с.-г. кампаніі ў РАСОНСКІМ, МСЬЦІСЛАЎСКІМ, ЧАЧЭРСКІМ, ГАРАДОЦКІМ, РАСЬНЯНСКІМ РАЁНАХ абвясьціць вымову загадчыкам райзэ гэтых раёнаў.

5) Адзначаючы абсалютна нездавальняючае кіраўніцтва з боку саўгастрэсту па падрыхтоўцы да веснавой с.-г. кампаніі, — даручыць пасеўбюро яшчэ раз абсьледаваць працу Саўгастрэсту па кіраўніцтве падрыхтоўкай да веснавой с.-г. кампаніі і на наступным пасяджэньні калегіі заслухаць даклады трэстаў і пасеўбюро.

6) За слабую мабілізацыю сродкаў на будаўніцтва МТС, за слабую працу па разгортваньні курсаў трактарыстаў і слабае правядзеньне працы па заключэньні дагавораў і рамонце трактараў і прычэпных машын — паставіць на від упаўнаважанаму Трактарацэнтру тав. Камаеву.

7) За недапушчальна слабае кіраўніцтва загатоўкамі насеньня з боку цэнтральнай кааперацыйнай сыстэмы і наляпняцьце сапраўдных мер, забясьпечваючых правядзеньне пляну загатовак насеньня, паставіць на від старшыні Садсаюзу тав. Пыжыкаву, нам. старшыні Белмалжывёласаюзу тав. Журомскаму, указаўшы старшыні Насеннаводкалгасцэнтру тав. Жарыну на невыстарчальны націск з яго боку на гэтыя арганізацыі пры правядзеньні загатовак насеньня, асабліва дэфіцытных культур.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

Апошняя пяцідзёўка студзеня ніякага пералому ў ільназагатоўках не дала. Замест павялічэньня тэмпаў загатовак мы маем далейшае рэзкае зьніжэньне. На 1 лютага гадавое заданьне па загатоўках ільнавалакна выканана на 26,1 проц., па пяньцы—на 8,5 проц., па ільняным семі—на 53,2 проц. і па каноплях—на 52,3 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што раённыя арганізацыі ўсё яшчэ не аддаюць належнай увагі загатоўкам ільну. У большасьці раёнаў да гэтага часу кулацка - заможныя гаспадаркі ня выканалі цьвёрдых заданьняў. Адсутнічае кантроль з боку раённых арганізацый за выкананьнем гэтых заданьняў.

Дрэнна таксама праходзіць здача ільну калгасамі. У ралье калгасаў здача ільну затрымліваецца з-за затрыманьня апрацоўкі яго.

Зусім слаба настаўлена масавараслумачальная работа. У выніку ў Пятрыкоўскім і Журавіцкім раёнах рад калгасаў утлесь свой ураджай ільну разьмеркавалі паміж калгасьнікамі, ня здаўшы дзяржаве ні аднаго кілё ільну.

Е. С.

Напярэдадні фінішу культэстафэ

На маршруце палітэхнізацыі—

РАД ПРАРЫВАЎ

Апартуністы з Белдзяржкіно ня ведаюць, якіх спэцыялістаў рыхтуюць. У Жлобіне, Шклове пра палітэхнізацыю школы толькі чулі...

Забясьпечыць рашучы пералом, па-бальшавіцку ажыцьцявіць баявы наказ партыі.

Майская сямігодка—прыклад узорнай работы

Майская сямігадовая школа калгасу «Расьсьвет - пераможца» па пастаноўцы работы і ўкараненьні палітэхнізацыі зьяўляецца прыкладам для ўсёй Бабруйшчыны.

У мінулым годзе майскую школу наведвалі дзесяткі экскурсій вучняў з розных раёнаў. І там сапраўды ёсьць чаму навучыцца.

Усе настаўнікі добра зразумелі важнасьць увядзеньня рабочых праграм школы з сучаснасьцю. Перш за ўсё яны паставілі сваёй мэтай ня толькі ўкараніць калектывізм у асяродзішча вучняў, але і прышчапіць ім працоўныя навыкі.

На былым школьным вучастку летась арганізаваўся вучнёўскі калектыў. У калектыў уступіла 120 вучняў (50 проц. складу школы).

Па ініцыятыве вучняў былі абагулены асноўныя сродкі вытворчасьці для іх калгасу — рыдлёўкі, вілы, граблі, плугі. Рассаду набылі з кааператыву. Апрача гэтага вучні - калгасьнікі ўвесну гэтага-ж году прывезьлі з дому каля 100 вазоў гною, ды столькі-ж сабралі на вуліцы.

Такім чынам чатыры гэктары былога школьнага вучастку былі добра апрацаваны і ўтоены сіламі самих вучняў і настаўнікаў. Самі малодзьвы калгасьнікі ўзоралі зямлю, апрацавалі грады.

Да гэтай плошчы заклалі парнікі рассады, прычым усю работу па засадцы, паліўцы і поліве град правялі самі вучні разам з настаўнікамі.

Рассада добра ўрадзіла. Палову рассады вучні здалі калгасу «Расьсьвет-пераможца», а рэшту рэалізавалі сярод аднасобнікаў Майскага сельсавету.

Трэба паказаць на важнасьць гэтага добрага пачынаньня кіраўнікоў Майскай школы для ўсяго калгасу. У Майскім сельсавеце ня было раней рассады, а цяпер «Расьсьвет - пераможца» значна пашырыў плошчу пад гарадамі і гэтым самым палепшыў рабочае забясьпячэньне.

Аднак, адной работай у калгасным гародзе кіраўнікі Майскай школы не абмяжоўваюцца. Яны дапамагаюць ва ўсіх работах калгасу: абразалі і аглядалі сад, працавалі на рассадцы гадавальніка, садзілі рассаду, рабілі кармушкі і г. д. Вучні ня толькі знаёміліся з работай ў якасьці гледачоў, але самі непасрэдна працавалі на полі: вазілі гной, баранавалі, працавалі калі машын.

Майская школа першай увяла палітэхнізацыю. Яна цяпер, у сувязі з перабудовай работы школ, можа быць лепшым прыкладам таго, як трэба наладжваць палітэхнічную работу працоўнай школы.

КАГО РЫХТУЕЦЕ?

Увосень 1930 г. у Віцебску адкрыта прафшкола кіно-работнікаў. Ініцыятыву ў гэтым з боку Белдзяржкіно і Наркамасьветы, зразумела, трэба толькі вітаць. Кіно - вучастак культфронту, які мае вялізарныя перспэктывы для свайго разьвіцьця, да гэтай пары не займаў належнага месца ў сыстэме падрыхтоўкі кваліфікаваных пралетарскіх кадраў.

І не дарма мясцовыя арганізацыі падхапілі надта сур'ёзна да гэтай прафшколы, адкрылі ле ў буйным пралетарскім раёне — па чыгуначным вузле, улілі ў яе лепшы пралетарскі маладзяк (70% рабочых).

Здаецца, зроблена ўсё, што патрэбна для пырокага разгортваньня палітэхнізаваўчага і спэцыяльнага навучаньня кіно-работнікаў, што рыхтуецца для Белдзяржкіно.

Але Белдзяржкіно, якому непасрэдна падпарадкавана гэта школа, злачынна нядбайна адносіцца да яе.

Вось ужо чатыры месяцы, як працуе школа без зацьверджаных праграм і навучальнага пляну, ня гледзячы на тое, што адміністрацыя школы сваталасова накіравала свой праект для праверкі і зацьверджаньня.

Больш таго, Белдзяржкіно дагэтуль не дало цьвёрдых, канкрэтных дырэктыў наконт таго, якіх спэцыялістаў павінна рыхтаваць школа. Няма ніякіх паказаньняў і аб набыцьці належнага абсталяваньня, аб парадку прахаджэньня вытворчай практыкі.

Ня лепш стаіць справа і з фінансаваньнем школы. Мінула больш месяца новага году, але кашторыс не зацьверджан, авансам ніякіх сродкаў на утрыманьне школы не адпушчана.

Паасобныя работнікі Белдзяржкіно праяўляюць недапушчальны бюракратызм, нядбайнасьць, шкодніцтва ў справе падрыхтоўкі кіно-кадраў.

Вось характэрны дакумант:

«Віцебскай прафшколе кіно-мэханікаў. Ставім да вашага ведама, што ваш штамп, якім вы зараз карыстаецеся, павінен быць заменен таму, што ў штампе ёсьць літары НКА, г. зн. Наркамасьветы, у той час, як мы ніякага дачыненьня да Наркамасьветы ў сучасны момант ня маем. Замест літар НКА вы павінны паставіць БДК—Белдзяржкіно.

Праўленьне Белдзяржкіно

МАТУСАЎ.

Экспаміст-юрыскансульт

БАРЭР».

Такая паперка накіравана 20 студзеня ў адказ на неаднаразовыя запытаньні школы аб мэтавай устаноўцы, набыцьці абсталяваньня, навучальным плянам і праграмах, зацьверджаньні каштарысу і выдачы сродкаў і г. д.

Калі яшчэ дадаць да гэтага, што штамп самога Белдзяржкіно на прыведзеным вышэй дакуманце пачынаецца тымі-ж самымі «шкоднымі» літарамі «НКА», дык камэнтары будуць лішнія...

Л. КАНТАРОВІЧ.

Шклоўскія не сьпяшаюцца...

БАЯВАЯ ЗАДАЧА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ЎСЕАГУЛЬНАГА НАВУЧАНЬНЯ, ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ І МАЛАПІСЬМЕННАСЬЦІ НА НІКЛОЎПІЧЫНЕ ЗРЫВАЕЦЦА. АСНОЎНАЯ ПРЫЧЫНА Ў ТЫМ, ШТО НА МЯСЦОХ ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ, ПРАФСАЮЗНЫЯ І САВЕЦКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ АДДАЮЦЬ ВЕЛЬМІ МАЛА ЎВАГІ ГЭТАЙ РАБОЦЕ.

У САМЫМ ГОРАДЗЕ ПРАКТЫЧНА НІЧОГА НЯ ЗРОБЛЕНА ДЛЯ ПАЛІТЭХНІЗАЦЫІ ШКОЛ. НА НАСТАЎНІЦКІХ КУРСАХ ПРАПРАЦАВАЛІ МАТАР'ЯЛ АБ ПАЛІТЭХНІЗЬМЕ І... НА ГЭТЫМ СПЫНІЛІСЯ.

НЕКАЛЬКІ РАЗ НАСТАЎНІКІ ЗВАРАЧАЛІСЯ ДА РАЙНСПЭКТАРА НАРАСЬВЕТЫ, ПРАСІЛІ, КАБ ЯН СКЛІКАЎ ГАРАДЗКІ СХОД УСІХ ЗАПАДЧЫКАЎ СЯМІГОДАК І ГАСПАДАРНІКАЎ, КАБ ПАСТАВІЦЬ РУБАМ ПЫТАНЬНЕ АБ ПАЛІТЭХНІЗАЦЫІ ШКОЛ, ПРЫМАЦАВАЦЬ ІХ ДА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ. АЛЕ РАЙНСПЭКТАР У ТАКІ ГАРАЧЫ ЧАС. КАЛІ ДЛЯ ЯГО ЕСЬЦЬ СТОЛЬКІ НЕПАСРЭДНАЙ РАБОТЫ, ПЭЛЬМІ ТЫДНЯМІ СЯДЗІЦЬ НА РАЕНЕ ПА ЗБОЖЖАЗАТАВОЎКАХ І ІНШЫХ КАМПАНІЯХ. АСНОЎНАЯ-Ж РАБОТА НЯ РУШЫЦЦА З МЕСЦА...

У ГАЛІНЕ ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ ПРАВЯЛІ ВУЧОТ І СУПАКОЙНСЯ... НІЯКАГА КІРАЎНІЦТВА НЯМА. НЯМА І ПАДРЫХТАВАЎ ДЛЯ НЯПІСЬМЕННЫХ І МАЛАПІСЬМЕННЫХ, НЯ ВЫЗНАЧАНЫ КІРАЎНІКІ.

Л.

Палітэхнізацыя на задворках

Па Жлобінскім раёне да гэтага часу культэстафэтай не ахоплены ўсе школы. Нічога ня робіцца ў Скепнянскім, Нова - Маркоўскім, Дабрагошчынскім сельсаветах.

Сам раённы штаб таксама «пачыў на лаўрах». Ужо каля месяца ня было ніякіх пасяджэньняў, ніхто з членаў штабу не выяжджаў у памяшканьня сельсаветы.

У Стрэшанскім сельсавеце загадчык сямігодкі тав. Сталяроў на запытаньне: як ідзе палітэхнізацыя школы, адмовіўся даць тлумачэньні, пачаў спасылацца па важнасьць бягучых кампаній, адсоўваць культэстафэту на другі плян.

Калі ўзяць горад, дык таксама справа ідзе марудна. Няпісьменныя не ахоплены лікпунктамі.

З 7.000 чалавек няпісьменных на раёне лікпунктам ахоплена каля 20 процантаў. Усеагульным навучаньнем ахоплена 92 проц. Каб ахапіць рэшту —ніхто нічога ня робіць.

З палітэхнізацыяй школ асабліва дрэнна. Школы не забясьпечаны абсталяваньнем, гаспадарнікі не дапамагаюць ім.

КУЛЬТАРМЕЕЦ.

АПОШНІЯ ДНІ ПЕРАВЫБАРАЎ МЕНГАРСАВЕТУ

ПРАВА НА МАНДАТ—

лепшым байцом сацыялістычнай будоўлі

У агні творчага энтузіязму нараджаецца савет трэцяга рашаючага

Дробныя прадпрыемствы! раўняйцеся па рабочых заводаў „Камунар", „Бальшавік", „Энэргія", „Кастрычнік", якія далі ўзор бальшавіцкага правядзеньня выбарчай кампаніі.

Апэрацыйная зводка перавыбараў Менгарсавету

(Паводле матар'ялаў з 80 выбарчых вучасткаў)

Па 80 выбарчых сходах выбрана ў гарсавет 220 дэпутатаў і 81 кандыдат. У ліку дэпутатаў — 55 жанчын (25 проц.), партыйцаў — 144 (65,5 проц.), камсамольцаў—21 (9,5 проц.), рабочых ад варштату—119 (54 проц.), вылучэнцаў—55 (25 проц.), служачых і іншых—46 чал. (21 проц.).

У ліку кандыдатаў жанчын — 19 (23,4 проц.), партыйцаў—27 (33,2 проц.), камсамольцаў — 12 (14,8 проц.), рабочых ад варштату — 53 (65,4 проц.), вылучэнцаў—11 (13,6 проц.), служачых і іншых — 17 (21 проц.).

Па больш буйных прадпрыемствах паведаньне сходаў здавальняючае. На гарбарні «Бальшавік»—100 проц., «Камунар»—100 проц., «Польмя рэвалюцыі»—100 проц., «Беларуская»—100 проц., «Энэргія» — 93 проц., Зьвод — 93 проц., чыгунка — 100 проц., «Дрэваапрацоўшчык» — 92 проц. і г. д.

У той-жа час па дробных прадпрыемствах лічна выбаршчыкаў на сходы НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЯ: аддзел хлебазавозу МЦРК—75,1 проц., шчотачная фабрыка — 70,7 проц., групком № 2 жыллаапрацыі — 65,2 проц., групкомы 1 і 2 саюзу харчавікоў—60,7 проц., МЦРК—50 проц. і г. д.

Слабае паведаньне перавыбарчых сходаў па паказаных вучастках зьяўляецца вынікам незьстарчальнай падрыхтоўкі да перавыбарчай кампаніі.

Паведаньне перавыбарчых сходаў па дробных прадпрыемствах— нездавальняючае

БЮРО ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ КП(б)Б ЗАСЛУХАЛА ІНФАРМАЦЫЮ ТАВ. АКСЮЧЫЦА АБ ХОДЗЕ ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ ГАРСАВЕТУ. БЮРО ПРЫЗНАЛА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМ ПАВЕДВАЛЬНЕ ПЕРАВЫБАРЧЫХ СХОДАЎ ГАРСАВЕТУ ПА ДРОБНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ (70-80 ПРОЦ.).

БЮРО АБАВЯЗАЛА ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, ДЗЕ ПЕРАВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ ЯШЧЭ НЕ АДБЫЛІСЯ, ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ 100 ПРОЦ. УДЗЕЛ ВЫБАРШЧЫКАЎ.

**

ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ВЫБАРАЎ ДЭПУТАТАЎ У ГАРСАВЕТ АД ПЛЕНУМАЎ СЕЛЬСАВЕТАЎ ПРЫГАРАДНАГА РАЕНУ БЮРО МАБІЛІЗАВАЛА 15 НАСТУПНЫХ Т. Т.: КАРНАЧОВА, НІСЭНБАЎМА, КАРАНЕЎСКАГА, КАЖДАНА, ЛОРЗКА, ШУЛЬКІНА, АКСЮЧЫЦА, ДЗІЧКОЎСКАГА, МАСЛАКОВА, ТАРАСЭВІЧА, МІНЦА, КУЛІНЕНКА, КАЗАКЕВІЧА, ШКІРЫЧА І ЛІЙЦА.

93 проц. выбаршчыкаў

На выбарчы сход рабочых і служачых кіраўніцтва сувязі і пабудовы аўтаматычнай тэлефоннай станцыі зьявілася 327 чалавек, што складае 93 проц. агульнага ліку выбаршчыкаў.

З вялікім уздымам абмяркоўваўся наказ Менгарсавету XIII скліканьня. Да кожнага пункту ўнесен рад дадаткаў.

Дэпутатамі выбраны рабочы вылучэнец — тав. Босы і тав. Какейеў (кіраўніцтва сувязі).

Сарвалі выбарчы сход

Менскі гарадзкі рабочком саюзу сельгасрабочых падвергнуў палітычнага значэньня перавыбарчай кампаніі. Падрыхтоўка да кампаніі праходзіла габінэтным парадкам, без удзелу членаў саюзу. Ніякага збору рабочых прапанаў да наказу не праводзілася, кандыдатуры ў гарсавет загадзя не абмяркоўваліся.

У выніку на першы выбарчы сход 30-га студзеня зьявілася ўсяго 25 процантаў выбаршчыкаў.

БРК с.-г. рабочых павінен прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у зрыве выбарчага сходу.

АГНОМАЎ.

Вайна прагульшчыкам, рвачом, пятунам

Арганізавана прышлі рабочыя і служачыя фабрыкі «ЧЫРВОНЫ ТЭКСТЫЛЬШЧЫК» на выбарчы сход у клюб камунальнікаў. На сход зьявілася 96 проц. выбаршчыкаў.

Пры вялікай актыўнасьці абмяркоўваўся наказ гарсавету XIII скліканьня.

Дадатні тэкстыльшчыкаў да наказу: УЗМАЦНІЦЬ БАРАЦЬБУ З ПРАГУЛЬШЧЫКАМІ, РВАЧАМІ І ПЯТУНАМІ; ПАБУДАВАЦЬ ДОМ - КАМУНУ ДЛЯ МОЛАДЗІ; ПАШЫРЫЦЬ СЕТКУ КУЛЬТУРНЫХ УСТАНОЎ.

У адказ на спробы клясавых ворагаў перашкодзіць пасьпяховаму сацыялістычнаму будаўніцтву, ажыцьцяўленьню пяцігодкі за чатыры гады, рабочыя і служачыя фабрыкі «Чырвоны тэкстыльшчык» УНЕСЬЛІ Ў ФОНД ДЫРЫЖАБЛЯБУДАЎНІЦТВА 82 РУБ. Збор сродкаў працягваецца.

Дэпутацыя мандаты атрымалі работніцы - ўдарніцы ЮШКЕВІЧ, ЗАЛЕТАВА і ЛЕВІНА.

М. САКАЛОЎСКІ.

Там, дзе ня было належнай падрыхтоўкі

З вялікім спазьненьнем пачаўся выбарчы сход рабочых і служачых садова - гародняй базы і апарату МЦРК.

Парт'ячэйка ЦРК і прафарганізацыі не скарысталі ўсіх магчымасьцяй для забясьпячэньня 100 проц. удзелу рабочых і служачых у перавыбарах. На сходзе прысутнічала толькі 66 проц. выбаршчыкаў. Пад канец сходу і гэта колькасьць зьменшылася.

У гарсавет выбраны т.т.: Абухоў, Плешакоў, Макрушыц, Баркоўскі, Маршак і Пушкарэвіч.

К.

Утрыманцы друкароў адсталі

3 лютага адбыўся перавыбарчы сход утрыманцаў рабочых і служачых друкарні імя Сталіна. Сход абгаварыў наказ дэпутатам гарсавету і ўнёс прапановы.

Выпучыць брыгаду для праверкі рацыянальнага скарыстаньня жыллоўшчы.

— Пабудаваць рад дамоў-камун.

— Палепшыць мэдычнае абслугоўваньне працоўнага насельніцтва, асабліва дзяцей.

— Узмацніць беларусізацыю шляхам арганізацыі пры ЖАКТ'ах гурткоў па вывучэньні беларускае мовы.

Сход выбраў дэпутатам у гарсавет тав. Бірыла—жонку рабочага - друкара.

Трэба адзначыць, што фабком друкарні правёў невыстарчальную работу сярод жонак рабочых.

У выніку на сходзе прысутнічала толькі 75 проц. выбаршчыкаў. Сход, замест 7 гадзіны, пачаўся ў 9 гадзін вечара.

М.

Электрыфікаваць прыгарадныя саўгасы і калгасы

Клюб гарсавету перапоўнены. На сходзе—87 проц. выбаршчыкаў ЦВК, СНК, НК унутраных спраў і ЦСПСБ.

Наказ Менгарсавету. Да кожнага разьдзелу ўносяцца дадаткі.

— ПАБУДАВАЦЬ ЯСЬЛІ Ў ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКА

НЯХАЙ ЖЫВЕ НЕПАХІСНЫ ЛЕНІНЕЦ,
НЕПРЫМІРЫМЫ БАРАЦЬБІТ З АПАРТУНІЗМАМ,
ЖАЛЕЗНЫ САЛДАТ РЭВАЛЮЦЫІ,
арганізатар перамог на франтох грамадзянскай вайны—народны камісар, луганскі сьлесар
КЛІМЕНЦІ ЯФРЭМАВІЧ ВАРАШЫЛАЎ!

Правадыр узброеных сіл рэвалюцыі

ДА 50-ГОДЗЬДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭНЬНЯ ВАРАШЫЛАВА

5 лютага спаўняецца 50 год правадыру ўзброеных сіл пралетарскай рэвалюцыі, Наркамваенмору СССР і старшыні Рэвваенсавету Саюзу Клімянцію Яфрэмавічу Варашылаву.

Варашылаў нарадзіўся 5 лютага 1881 г. у сяле Верхні, был. Кацярынаслаўскай губэрні. Бацька Варашылава—вартаўнік чыгункі. З-за сваёй «вольнадумнасьці» часта бываў без работы, матка працавала падёнка «ў людзях».

Будучы нарком з раньняга дзяцінства адчуў беднасьць. Працаваць ён пачаў ужо з 6—7 год, спачатку зборшчыкам калчадана на капальнях, потым падпаскам у памешчыка. Маленькі Клім батрачыў, працаваў «мальчыком» па капальнях і ў майстэрнях.

У 1896 годзе Варашылаў паступае рабочым на завод пры станцыі Алчаўскай. Тут ён трыляе у катэгорыю «неблагонадежных».

Яго сыстэматычна прасьледуюць адміністрацыя, паліцэйскія і «начальства». Але гэта толькі паскорыла пераход Варашылава на шлях рашучага рэвалюцыйнага змаганьня.

У 1899 годзе пад яго кіраўніцтвам у чугуна-ліцейным цэху выбухае забастоўка, у выніку якой Варашылаў быў арыштаваны. Пасьля вызваленьня з-пад арышту Варашылаў тры гады быў без работы, бо ўсе заводы і капальні Данбасу алмаўлялі ў прыёме «смутьяну», занесенаму ў «чорныя сьпісы» палітычна «неблагонадежных».

Толькі ў 1903 годзе Варашылаву ўдалося паступіць на завод Гартмана ў Луганску, дзе ён уступіў у Расійскую Сацыял-Дэмакратычную Рабочую Партыю. У 1904 годзе Варашылаў уваходзіць у ЦК РСДРП і адразу дамучаецца да фракцыі бальшавікоў.

У 1905 годзе Варашылаў працуе на Гартманскім заводзе, дзе кіруе забастоўкамі рабочых. У гэты перыяд завод Гартмана зьяўляецца цэнтрам расійскага рабочага руху. На заводзе арганізуецца дэпутацкі сход і прафесыянальны саюз заводзкіх рабочых. **Старшынёй абедзьвюх гэтых першых пралетарскіх арганізацый рабочыя выбралі Варашылава, які карыстаўся вялізарнай папулярнасьцю і любасьцю луганскіх рабочых.** У 1905 годзе луганцы вызвалілі Варашылава з турмы. У 1906 годзе, у дні рэакцыі Варашылаў ушоў у падпольле.

У пачатку 1906 г. Варашылаў быў пасланы на Стокгольмскі зьезд партыі, дзе сустрэўся з Леніным і радам іншых выдатных бальшавікоў. Пасьля прыезду са Стакгольму працуе па падрыхтоўцы партыйнай арганізацыі да баявых дзеяньняў.

У 1907 г. Варышалаў, як луганскі делегат, прымае ўдзел на агульнапартыйным зьезьдзе ў Лёндане і ў ліпені таго-ж году пасьля паўдніёва-расійскай партыйнай канфэрэнцыі ў Кіеве пачынаецца паласа яго арыштаў, ссылак, вобыскў і сьлежкі. Яго арыштоўваюць і высылаюць у Архангельскую губ., адкуль ён праз месяц уцякае і пакіроўваецца ЦК партыі на падпольную работу ў Баку, потым у Пецярбург, дзе зноў быў арыштаваны і высланы.

З першых-жа дзён лютаўскай рэвалюцыі Варашылаў уваходзіць у Петраградзкі Савет Рабочых Дэпутатаў, адначасова працуючы там у якасьці члена бюро фракцыі бальшавікоў. У лютым 1917 году луганскі пралетарыят патрабаваў звароту Варашылава ў Луганск. Тут ён быў спачатку выбарным старшынёю Луганскай гарадзкой думы, потым старшынёю Луганскага Савету Рабочых Дэпутатаў.

Увесь перадкастрычніцкі перыяд Варашылаў узмоцнена працаваў над узбраеньнем рабочых, над стварэньнем атрадаў Чырвонай Гвардыі. Ужо ў сакавіку 1918 г. Варашылаў бецца на чале арганізаванага ім партызанска-камуністычнага атраду з нямецкімі акупацыйнымі вайскамі.

З красавіка 1918 г. усе партызанскія атрады, што дзейнічалі супроць немцаў, былі зьведзены ва ўкраінскую армію, камандуючым якой быў выбран Варашылаў.

З лістапада 1918 г. Варашылаву даручаецца камандваньне 10 арміі. Працуючы на Украіне, ён выбіраецца членам ЦК КП(б)У. З мая 1919 г. Варашылаў камандуе 14-й арміяй. Яго абарона Царыцына—бліскучы разьдзел у гісторыі Чырвонай арміі.

Варашылаў адзін з твэрцоў нашай Чырвонай конніцы і з кастрычніка 1919 г. назначаецца членам Рэвваенсавету 1-й конпай арміі.

Пасьля скончаньня грамадзянскай вайны ў 1921 г. Варашылаў — камандуючы вайскамі Паўночна-Каўказкай вайсковай акругі. У тым-жа годзе на X зьезьдзе партыі ён выбіраецца членам ЦК УсеКП(б) і з таго часу выбіраецца ў ЦК усімі наступнымі партыйнымі зьездамі.

З 1924 году Варышалаў—член Рэвваенсавету СССР і камандуючы Маскоўскай Вайсковай Акругай. З 1921 г. бесьперапынна выбіраецца членам ЦВК СССР. З 1926 г. нязьменна член Палітбюро ЦК УсеКП(б).

Закліканы пасьля сьмерці Фрунзэ на пост кіраўніка ўсімі ўзброенымі сіламі Савецкага Саюзу, Варашылаў прыступіў да практычнага ажыцьцяўленьня рэформы ў арміі, асноўныя палажэньні якой былі распрацаваны пры яго энэргічным удзеле яшчэ пры жыцьці Фрунзэ.

Рэзультаты плённай работы Варашылава ў наяўнасьці: Чырвоная армія ў цэлым, зараз, як гэта вымушаны прызнаць і нашы ворагі, вырасла ў магутную сілу, якая пільна стаіць на варце недатыкальнасьці межаў Савецкага Саюзу.

28 год Варашылаў знаходзіцца ў радох бальшавіцкай партыі. У барацьбе з трацкізмам і правым апартунізмам у радох партыі Варашылаў праяўляў непрымірымую, ленінскую рашучасьць, будучы заўсёды ў яе першых радох.

За баявыя заслугі Варашылаў узнагароджан 4-ма ордэнамі Чырвонага сьцягу і гапаровай зброяй.

Арганізатар арміі першакляснай тэхнікі

Аўтадораўцы павінны заўсёды быць гатовымі перасесьці ад руля аўтамабіля і трактара за рупь бронямашыны і танка.
ВАРАШЫЛАЎ.

Карыстаючыся аднадушнай дапамогай партыі і ўсёй Чырвонай арміі, М. В. Фрунзэ правёў у жыцьцё карэнную рэарганізацыю нашых узброеных сіл і вызначыў лінію разьвіцьця тэрытарыяльна-міліцыйнай сыстэмы.

Закліканы пасьля сьмерці Фрунзэ на пост кіраўніка ўсімі ўзброенымі сіламі Савецкага Саюзу, Варашылаў прыступіў да практычнага ажыцьцяўленьня вызначаных Фрунзэ мерапрыемстваў і **зьяўляецца сапраўдным арганізатарам будаўніцтва ўзброеных сіл ва ўмовах рэконструкцыйнага пэрыяду.**

Варашылаў зьяўляецца арганізатарам тахнічнай базы, магутнага тэхнічнага «оснащения» Чырвонай арміі, умелым віраўніком нашай пралетарскай арміі.

Якой сабе Варашылаў прадстаўляе Чырвоную армію — сьведчаць яго словы, сказаныя ім на IX зьезьдзе камсамолу:

«Нападу на нас мы павінны супроцьпаставіць нашу жалезную высокаманавучаную, палітычна стойкую, добра ўзброеную бальшавіцкую армію».

Узмацненьне магутнасьці Савецкага Саюзу выклікае нянавісьць у імпэрыялістаў. Бязупынным узмацненьнем сваіх армій, яны стараюцца іх падрыхтаваць для будучых сутычак з Савецкім Саюзам. Асабліва ўвага аддаецца ўзмацненьню тэхнічных сродкаў барацьбы. Эпоха, якую мы зараз перажываем, можа быць названа «эпохай мэханізацыі і матарызацыі армій усяго сьвету».

Самалёты, аўтамабілі, трактары і ўсялякія машыны спэцыяльнага прызначэньня сталі патрэбны для армій ня толькі як транспартныя сродкі, але і як баявыя сродкі, здольныя, дзякуючы сваёй вялікай рухавасьці, аказваць добрую садзейнасьць асноўным родам войск пры выкананьні імі адказных баявых задач.

Бурны рост нашай аўта-трактарнай індустрыі зьяўляецца адным з асноўных фактараў у справе «оснащения» Чырвонай арміі мэханічнымі сродкамі.

Асновы сучаснай тактыкі і апэрацыйнага ўмельства пабудаваны на шырокім ужываньні манэўру. Ажыцьцяўленьне гэтага манэўру ў сучасных умовах магчыма толькі ў тым выпадку, калі баявыя апэрацыі будуць базавацца ня толькі на мускульнай сіле байцоў, але і на цесным злучэньні мускульных сіл з сучасным рухавіком унутранага згараньня.

У дні юбілею тав. Варашылава мы павінны да пытаньняў «оснащения» Чырвонай арміі мэханічнымі сродкамі барацьбы прыцягнуць усю савецкую грамадзкасьць і ў першую чаргу аўтадораўцаў.

Зарука посьпеху мэханізацыі і матарызацыі часьцей РСЧА будзе залежаць ад таго, наколькі глыбока мы здолеем уявіць, што, будуючы машыну для транспарту або трактар для сельскай гаспадаркі, мы гэтымі машынамі павінны ў асноўнай масе «оснащать» арміі.

Аднак, ня толькі аўтамабільмі можна вычарпаць пытаньні мэханізацыі і матарызацыі арміі. Без падрыхтоўкі належных кадраў для абслугоўваньня і эксплёатацыі машын, пытаньне аб матарызацыі ня можа быць вырашана.

Тут багатае поле дзейнасьці для аўтадораўскіх арганізацый. Трэба ўсе аўтамабільныя курсы Аўтадору ваяніізаваць, трэба арганізаваць спэцыяльныя курсы танкістаў і вадзіцеляў баявых машын для аўтадораўцаў.

Аўтадораўская грамадзкасьць праняла рад работ на аўтамабілізацыі і трактарызацыі нашай краіны. Трэба, каб з такім-жа энтузіязмам і настойлівасьцю Аўтадор прыняў самы актыўны ўдзел у мэханізацыі і матарызацыі Чырвонай арміі.

І ў дні юбілею правадыра Чырвонай арміі гэта пажаданьне падрыхтавацца да ўмелай і энэргічнай абароны краіны Саветаў павінна быць найхутчэй праведзена ў жыцьцё.

ГОРДЗІН.

Юрка Лявоны

Мы не аддзелім гэроя ад клясы!

З Усходу і з Захаду,
з Поўначы, з Поўдню
Рэспубліку мкнуцца
ў хамут упрагчы.
І рвуцца гранаты,
і сьвецяць паходні
Ураньні і ўвечары,
удзень і ўначы.

Ды толькі што ўзялі,
што самі рашылі —
Ніхто не пасьмее
у нас адняць!
Луганскі сьлесар
Клім Варашылаў,
Клім Варашылаў —
на каня!

І помніць Самара,
і знае Украіна
Грымотныя ўдары
і лаву атак.
Па ніках, на стрэльбах,
па шабельнай стыні
Ляжаць перамогі
бясстрашных ваяк.
Жалезнай сьцяною
паўстане Царыцын
(Падзеі ліюцца
вадой),
Ды белай навале
ня будзе карыцца
Ні Кіеў, ні Волга,
ні Дон!..
Часы зіхацелі
Баяцкай акрасай;
Мы не аддзелім
Гэроя ад клясы!

Суровая школа —
Гадамі — падпольле,
І ночы бяссоньня,
І холад пагоні
Да споў пя прывык
Правадыр - бальшавік)..
І ў мірныя годы —
Шляхамі паходаў —
Ў індустрыі звоне
Мацуй абарону,—

Каб па дзьвярох
Былі моцны прабоі,
Каб кожны бярог
Будаўніцтва развоі!

... І чую —
Фанфары па росстань,
І бачу—
Рады напяклі,
Наперадзе—мужная постаць
З імем кароткім «Клім».

Гэта зноў
Пад чырвоныя зоры
Праходзіць, скрозь грукат і гром,
На буру, па стрэлы, на порах
Ў зялёнай шынэлі нарком.

Гэта зноў,
Для апошняга старту,
На заклік
Палёў і машын
Паўстала пяломная варта
Варожыя хмары скрышыць!

30-I—31.

Як узбройваюцца нашы ворагі

ФРАНЦЫЯ. Перад пачаткам імпэрыялістычнай вайны, 1914-1918 год мела 1.300 кулямётаў, зараз—35 тыс.

АНГЛІЯ. Мела 990 кулямётаў, зараз—13 тыс.

ПАЗШ. Мела 1.300, зараз—30 тыс.

Танкаў у пачатку сусьветнай вайны на было. Зараз іх у Францыі 2000, у Англіі—450, ПАЗШ—550.

Якасьць узбраеньняў значна ўзрасла. Напрыклад, у авіяцыі ёсьць бамбавозы, якія падымаюць па 12 тон карыснага грузу.

У пяці дзяржавах: Францыі, Англіі, Амэрыцы, Італіі і Японіі замест 56 крэйсераў у 1922 г. паводле плану да 1932 г. будзе—222; мінаносцаў замест 437—831, падводак замест 153—461.

Фінансаваньне будучай вайны хутка ўзрастае. У 1913 г. 5 дзяржавамі выдаткаваліся на армію 2.300 мільёнаў. У гэтым годзе выдаткоў ацэнена 5.700 млн.

Паўночна-амэрыканская экспэдыцыйная армія, якая дзейнічала на палёх Францыі, у 1918 годзе складалася з 2 млн. чал. І мела 5 гармат, 300 танкаў, 2 тыс. самалётаў і 40 тыс. аўтамабіляў.

У 1920 г. актам нацыянальнай абароны ПАЗШ у законадаўчым парадку армія на выпадак вайны была вызначана ўжо ў 3.500 тыс. чал., гармат—15 тыс., танкаў—3 тыс., самалётаў—5 тыс. і аўтамабіляў—200 т.

Успаміны аб Варашылаве

ШТУРМ КРАНШТАДТУ

Здраднікі рэвалюцыі падняялі ў Кранштаце мяцеж. Англа-францускія грошы зрабілі сваю агідную справу.

Чырвоныя войскі рыхтаваліся да штурму. Трэба было сьпяшацца. Набліжалася вясна. Сонца здольна было растапіць лёд вакол Кранштата і тады яго ўзяць было-б больш цяжка.

— Кранштат трэба зараз-жа вырваць з рук здраднікаў.

Загад аб штурме быў аддадзены:

— Роўна ў 6 гадзін раніцы 17 сакавіка ўварвацца ў Кранштат. Трэба сьпяшацца, пакуль не пачарнеў і не падтаяў лёд. Памерці, але перамагчы.

Настала 17 сакавіка. Гадзіна і трыццаць хвілін ночы. У густым тумане адзін за адным, без шуму, спускаліся на лёд чырвоныя палкі. Ледзь паскрыпваў пад нагамі сьпег. Усе байцы былі апрануты ў белыя халаты.

Радавымі байцамі ішлі наперадзе члены X зьезду камуністычнай партыі. Сярод іх Варашылаў, Бубноў і іншыя.

У 4 гада. 30 хв. раніцы на левым флянгу застракатаў кулямёт. Яшчэ хвіліна—і трэск дзесяткаў кулямётаў і ружэйных залпаў узарвалі цішыню. Загрукацелі гарматы мяцежнікаў.

Здалёку пачуліся пешыя крыкі «ура». Форт № 1 узят.

***

Сьмяротны агонь мяцежнікаў касіў ішоўшыя па ільду чырвоныя часьці.

Адзін з батальёнаў 167-й брыгады пахіснуўся. Байцы на вытрымалі шалёнага агня і пачалі адступаць.

Зваду рушыўся полк тав. Фабрыцыўса. Фабрыцыус ненакоўся, каб настрой адступаючых не перакінуўся на яго полк.

Тут-жа на ільду, пад страшным агнём ворага Фабрыцыус загадаў палку легчы.

На дапамогу Фабрыцыўсу падасьпелі **Варашылаў і Бубноў. Яны, ня зігаючыся, хадзілі сярод пляжачых радоў і аддавалі загады.**

Праз чатыры хвіліны полк быў паднят і кінут у атаку.

Успамінаецца **такі выпадак. Варашылаў, Бубноў, Дыбенко** і рад іншых таварышоў знаходзіліся ў памяшканьні, якое было прыстасавана пад штаб.

Будынак пачалі абкружаць мяцежнікі. **Варашылаў** выбег са штабу, прыняў камандваньне над невялікім атрадам і кінуўся на ворага.

Мяцежнікі былі адбіты. **Варашылаў** прапанаваў ім здацца. Тыя згадзіліся. Без страху рушыўся да іх **Варашылаў** для перагавораў аб здачы.

Толькі ён падыйшоў да іх крокаў на 20, як здраднікі адкрылі на **Варашылаву** агонь з кулямёта. **Варашылаў зымушан быў схавацца за выступам плоту.** Мяцежнікі асыпалі яго градам куль.

Нашы кінуліся на выручку. Подлых здраднікаў вымусілі ўцячы. Пад камандай Варашылава атрад мяцежнікаў быў разьбіт.

Хто нам дапамагаў

(З ПРАМОВЫ ТАВ. ВАРАШЫЛАВА НА СУСЬВЕТНЫМ ЗЬЕЗЬДЗЕ ПРЫХІЛЬНІКАЎ СССР 12 ЛІСТАПАДА ГОДУ).

Таварышы! Кастрычніцкая рэвалюцыя зьяўляецца рэвалюцыяй міжнароднага пралетарыяту.

Мы, рабочыя і сяляне савецкіх рэспублік, у цяжкім змаганьні несьлі вялізарныя ахвяры. Крывёю працоўных нашай краіны залітыя сотні і тысячы кілёмэтраў цяпер ужо савецкае зямлі.

Мы павінны былі пераносіць голад, холад і павальныя заразьлівыя хваробы.

Але ўсе мы, і Чырвоная армія ў тым ліку, вельмі добра разумеем, што нам самім немагчыма было-б здбіцца ад нашых клясавых ворагаў.

Мы ведаем, што толькі пры дапамозе сусьветнага пралетарыяту наша змаганьне заканчылася посьпехам.

Сусьветны пралетарыят аказаў нам самае актыўнае падтрыманьне.

Брацкае спачуваньне і бязупынная дапамога працоўных мас спрыялі нашым перамогам на франтох грамадзянскай вайны.

Калі-б не рабочыя і сяляне Нямеччыны, Францыі, Вэнгрыі, Англіі, Польшчы, Чэхаславакіі і іншых краін, мы ў грамадзянскай вайне не зьвяліся-б пераможцамі.

Пралетарыят і працоўныя масы СССР ведаюць, што ў будучых бойках з намі будзе ўсё працоўнае чалавецтва.

Мэханізуем армію

Зьыш двух год таму назад аўтадорам была паднята кампанія за сбор сродкаў на пабудову атраду шасьцікалёсных аўтамабіляў для Чырвонай арміі.

На гэтым заклику многія арганізацыі Аўтадору пачалі збор сродкаў, але-ж да гэтага часу яшчэ ня ўсе адазваліся і калектывы Аўтадору ўключыліся ў гэту кампанію.

За апошнія часы ў сувязі з узмоцненай падрыхтоўкай да інтэрвэнцыі СССР з боку імпэрыялістычных дзяржаў трэба яшчэ больш узмацніць работу па ўзьвяньці абароназдольнасьці краіны, за ўзмацненьне Чырвонай арміі.

У дні юбілею правадыра РСЧА т. Варашылава, менскае аддзяленьне Аўтадору БССР у мэтах аказаньня аўтадораўскай арганізацыі гор. Менску рэальнай дапамогі ў справе ўзмацненьня абароназдольнасьці БССР, пастанавіла ўключыцца ў кампанію па сборы сродкаў на пабудову да 13 гадавіны Чырвонай арміі (23 лютага 1931 г.) атраду шасьцікалёсных аўтамабіляў для Чырвонай арміі, узяло на сябе кантрольную лічбу ў 5.000 руб., разьмеркаваўшы гэту суму па ўсіх ячэйках г. Менску. Гэта пытаньне абгаварвалася на нарадзе ячэек, скліканай 21-Х, дзе атрымала поўнае падтрыманьне. Трэба каб ячэйкі безадкладна вылучылі цэхавых і іншых упаўнаважаных, якія-б зараз-жа ўзяліся за правядзеньне гэтай кампаніі.

Усе сабраныя сродкі павінны безадкладна здавацца ў праўленьне.

ЛЕВІН.
ВІНАГРАДАЎ.

Хэмічная зброя ў тылу

(Артыкул нач. ВОХІМУ РСЧА)

Можна ужо зараз з усёй выразнасьцю сказаць, што паралельна з агнятрывалай зброяй, якой узброены розначага роду войскі, у армію ўкараняецца і хэмічная зброя.

Такое хуткае нарастаньне значэньня хэмічнага ўзбраеньня ў армії ёсьць вынік бурнага росту хэмічнай прамысловасьці ў пасьляваенны час. Сусьветная хэмічная прамысловасьць патроіла сваю прадукцыю ў параўнаньні з даваенным узроўнем. Асабліва разьвіцьцё атрымалі тыя галіны хэмічнай прамысловасьці, якія зьяўляюцца важнымі для рабочае справы.

Зусім відавочна, што пры сутычках сучасных буйных армій, на розных тэатрах вайны і незалежна ад характару яе, хэмічныя сродкі барацьбы будуць прыстасаваны ў самым шырокім маштабе. Існуючыя міжнародныя канвэнцыі аб забароне ўжываць хэмічную зброю ніякіх рэальных гарантый не даюць.

Таму пытаньні супроцьхэмічнай абароны тылу, блізкага і далёкага, ня толькі захоўваюць сваю ранейшую вострасьць, але набываюць яшчэ большую.

У бліжэйшым тылу грамадзянскае насельніцтва будзе цярпець ад усіх відаў хэмічнай зброі. У часе імпэрыялістычнай вайны ў сувязі з стабільнасьцю фронтаў, грамадзянскае насельніцтва проста эвакуявалася з франтавой зоны. Ва ўмовах манэўранай вайны, пры хуткіх перамяшчэньнях ліній фронту, насельніцтва ня будзе пасьпяваць эвакуявацца і часта будзе нападаць у сфэру ваенных дзеяньняў.

Асабліва вялікія маштабы можа набыць у сучаснай вайне выпуск атрутнага дыму, дзякуючы розным досьледам і ўдасканаленьням у гэтай галіне. Дальнасьць дзеяньняў газавых або атрутна-дымавых хвалій вылічваецца дзесяткамі кілёмэтраў. Такім чынам, атрутныя матэрыі могуць нечакана прасякаць у гарады і вёскі, паражаючы людзей і хатнюю жывёлу.

Таму ва ўвесь рост паўстае праблема проціхэмічнай абароны сельскага і гарадзкога насельніцтва даволі глыбокай прыгранічнай паласы ад наземнага хэмічнага нападу. Гэта і ёсьць тое новае, што высоўваецца зараз у сувязі з пасьляваеннымі дасягненьнямі за рубяжом у тэхніцы хэмічнага нападу.

Проціпаветраная тэхніка дасягнула ў пасьляваенныя гады таксама вельмі высокага ўзроўню. Тым ня менш работа па проціхэмічнай абароне глыбокіх тылоў вялікіх населеных цэнтраў, фабрычна-заводзкіх раёнаў, чыгуначных вузлоў і г. д. павінна праводзіцца інтэнсыўна, бо хэмічныя палёты паветраных флётаў, бязумоўна, будуць мець шырокае разьвіцьцё ў сучаснай вайне і часта будуць мець посьпех, ня гледзячы на меры супроцьпаветранай абароны.

Арганізацыя проціхэмічнай абароны грамадзянскага насельніцтва сутыкаецца з наступнымі затрудненьнямі і абставінамі, якія спрыяюць хэмічнаму нападу: вялікая скучанасьць жыхароў у гарадох па параўнаньні невялікіх адлегласьцях, наяўнасьць у гарадох высокіх пабудоў, якія перашкаджаюць зносу атрутных газаў ветрам, труднасьць забесьпячэньня ўсяго грамадзянскага насельніцтва індывідуальнымі сордкамі проціхэмічнай абароны і г. д.

Вось чаму работа сэкцый паветрана-хэмічнай абароны Асоавіяхіму павінна згуртавацць сваю ўвагу, галоўным чынам, на арганізацыі проціхэмічнай абароны грамадзянскага насельніцтва як пагранічнай паласы, так і глыбокага тылу, а іменна, на забесьпячэньні індывідуальнымі сродкамі абароны, у першую чаргу, процігазамі, якія цалкам адпавядаюць сучасным патрабаваньням проціхэмічнай абароны населеных пунктаў; далей на арганізацыі проціхэмічнага абсталяваньня памяшканьняў і розных сховаў на прадпрыемствах, ва ўстановах і г. д., на забесьпячэньні дэгазацыйнымі сродкамі і вывучэньні найлепшых спосабаў дэгазацыі ва ўмовах населеных пунктаў, на арганізацыі падрыхтоўкі і навучаньня грамадзянскага насельніцтва карыстаньню ўсімі гэтымі проціхэмічнымі сродкамі і змаганьню з усімі відамі сучаснага хэмічнага нападу.

У сучасны момант работа па арганізацыі проціхэмічнай абароны знаходзіцца яшчэ ў сваёй пачатковай стадыі. Асабліва мала ўвагі зварачаецца на пытаньні абароны грамадзянскага насельніцтва блізкага тылу.

Сэкцыям ВХО Асоавіяхіму неабходна разгарнуць інтэнсыўную работу па проціхэмічнай абароне ў калгасах і саўгасах прымежных абласьцей, улічваючы, што арганізацыя проціхэмічнай абароны ў калгасе і саўгасе дапаможа таксама цягненьню ў гэту справу шырокіх сялян-аднаасобнікаў.

Вострасьць міжнароднага становішча, узмоцненая падрыхтоўка імпэрыялістаў да нападу на нашу краіну патрабуюць ад сэкцый ВХО Асоавіяхіму самай напружанай работы па выкананьні пакаваных задач.

Пры ажыцьцяўленьні ўсіх пакаваных мерапрыемстваў па проціхэмічнай абароне, дзейнасьць хэмічных нападаў значна вымешыцца. Хэмічны напад капіталістычных армій і іх паветраных флётаў будзе параліжаваным жалезнай проціхэмічнай дысцыплінай грамадзянскага насельніцтва Савецкага Саюзу і правільнай арганізацыяй проціхэмічнай абароны ўсяе краіны.

Я. Фішман.

Дом Чырвонай арміі—да юбілею т. Варашылава

Дом Чырвонай арміі арганізаваў **выстаўку жыцьця і рэвалюцыйнай дзейнасьці Кліма Варашылава.**

Арганізавана таксама выстаўка літаратуры, прысьвечанай дзейнасьці тав. Варашылава.

Нядаўна пры доме Чырвонай арміі створан ансамбль чырвонаармейскай песьні ў складзе 40 чал. Ансамбль рыхтуе спэцыяльную праграму да юбілею.

Заўтра ў ДЧА адбудзецца ўрачысты вечар начскладу РСЧА, прысьвечаны юбілею тав. Варашылава.

Хроніка сьвяткаваньня юбілею тав. Варашылава

— Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў у дзень 50-цігодзьдзя правадыра Чырвонай арміі тав. Варашылава правесьці на фабрыках і заводах гутаркі аб рэвалюцыйнай дзейнасьці тав. Варашылава, арганізаваць праверку шэфства рабочых над Чырвонай арміяй.

— На прадпрыемствах МЭТАЛЯПРАМЫСЛОВАСЬЦІ праводзяцца гутаркі аб жыцьці і дзейнасьці тав. Варашылава. Папаўняюцца рады ячэек Асоавіяхіму. На заводах адбудуцца мітынгі і вечары, прысьвечаныя юбілею.

РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ «КАМУНАР, ПАДПІСАЛІСЯ ДАДАТКОВА НА 60 Р. У ФОНД ПАБУДОВЫ ДЫРЫЖАБЛЯ «КЛІМ ВАРАШЫЛАЎ».



ПАШЫРЫМ ФІНАНСАВУЮ БАЗУ

гаспадарчага і культурнага будаўніцтва

Апартуністычная стаўка на самацёк, прымірэнцтва да кулака, спасыланьне на „аб'ектыўныя" ўмовы, парушэньні фінансавай дысцыпліны, — тармозяць мабілізацыю сродкаў насельніцтва.

ПАТРЭБЕН РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ у выкананьні плянаў мабілізацыі сродкаў першага кварталу

Калгасьнікі, беднякі і сераднякі—ухваляюць паставу ўраду аб адназразовым зборы

ПОЎНАСЬЦЮ І Ў ТЭРМІН

рэалізаваць пазыку „Пяцігодка —за 4 гады"

Найбольш адказным вучасткам у кампаніі, як і раней, застаецца вёска, якая выканала свой плян толькі на 41,1%. Ганебнае адставаньне вёскі сьведчыць аб слабе разгорнутай рабоце вясковымі камсамолам і кредытнымі установамі.

Есьць і такія раёны, якія літаральна завьдзейнічалі ў галіне рэалізацыі пазыкі. Вось яны: Азарыцкі, які выканаў плян на 28,9 проц., Барысаўскі — на 27,6 проц., Высачанскі — 25,8 проц., Слуцкі — 28,7 проц., Гарадоцкі — 26,9 проц., Гомельскі — 25,1 проц., Жлобінскі — 27,3 проц., Журавіцкі—20,1 проц., Мехнаўскі—27,5 проц., Мазырскі—25,4 проц., Лясўскі — 26,7 проц., Лепьчыцкі — 21 проц., Мсьціслаўскі — 19,6 проц., Рэчыцкі — 18,7 проц., Хоцімскі — 20,7 проц.

Апошні тэрмін рэалізацыі пазыкі — 1-га сакавіка. Цэнтральная камісія сацыйнасьці дазьвяргнула пры ЦВК БССР дзва катэгарычнае паказаньне сім гарадскім і раённым камсадам аб „вычэрпаньні пляну рэалізацыі поўнасьцю і ў тэрмін.

Адначасова цэнтральная камісія сацыйнасьці прапанавала на працягу першых дзён лютага правесьці самаправерку стаўленьня рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады».

Даць трэцяму году пяцігодкі дадатковых 3 з паловай міл. руб., уцягнуць у падпіску не пазыку новыя тысячы рабочых і сялян, забясьпечыць свачасовае паступленьне сродкаў і поўную рэалізацыю пляну — вось асноўныя задачы самаправеркі.

З гэтых асноўных задач выпынаюць 4 абавязкі камісіі сацыйнасьці дазьвяргнуцьу. Не адкладваючы ні на адну хвіліну, на-баявому прыступіць да самаправеркі на кожным заводзе і фабрыцы, на ўсіх калгасах і саўгасах і сярод адназосных гаспадарак.

А. ЛЬВОЎ.

АПОШНІ ТЭРМІН—1 САКАВІКА

Сіроцінскі райфінаддзел пачаццае ўзоры бальшавіцкай работы

Пастанова ўраду БССР аб увядзеньні адназразовага збору знайшла шырокі водгук сярод калгасьнікаў і бядняцка-сераднянкіх мас сялянства. Амаль кожны дзень рэдакцыя атрымлівае лісты з месц, у якіх калгасьнікі і бядняцка-сераднянкія масы вітаюць пастанову ўраду БССР. Але ў радзе раёнаў арганізацыі яшчэ ня сталі на чале ўзросшай актыўнасьці калгасных і бядняцка-сераднянкіх мас, недоцанілі палітычнага значэньня адназразовага збору. Тэрміны налічэньня адназразовага збору прапушчаны: ня гледзячы на гэта, 24 раёны на сёньняшні дзень не паведамілі ЦКФ ні аб налічэньні збору, ні аб перадачы платнікам паведамленьняў. Да такіх раёнаў адносяцца: Багушэўскі, Бабруйскі, Старобінскі, Сьвіслацкі, Віцебскі, Высачанскі, Гарадоцкі, Лёзьненскі, Брагінскі, Камарынскі, Лоеўскі, Хоцімскі, Царахайскі, Чачэрскі, Прагойскі, Азарыцкі, Турэўскі, Барысаўскі, Бягомльскі, Кейданаўскі, Вузьдзенскі, Гульскі, Вушачскі і Дрыбінскі. Гэтыя 24 раёны груба парушылі ўстаноўленыя тэрміны для скончэньня налічэньняў адназразовага збору.

Паводле дырэктыў ураду, адназразовы збор павінен быў быць спагнаны з кулацтва не пазьней 1-га лютага. На сёньняшні дзень толькі 13 раёнаў паведамілі аб спагнаных сумах з кулацтва. Іншыя раёны ўпарта маўчаць. Адсюль вывад напрошваецца сам на сабе: спагнаньне адназразовага збору з кулацкіх гаспадарак за ўстаноўлены тэрмін выконваецца марудна, з прычыны правапартуністычнай практыкі раду мясцовых органаў.

Практыка паказала, што там, дзе раёны на-бальшавіцку ўзяліся за рэалізацыю пастановы ўраду, там дасягнуты значныя посьпехі. Так, Сіроцінскі райфінаддзел скончыў работу па налічэньні збору і паручэньні платнікам паведамленьняў яшчэ 24 студзеня.

Да 10 лютага павінна быць спагнана ня менш 70 проц. налічанага збору, а да 1-га сакавіка неабходна спагнаць поўнасьцю.

М. Т.

Толькі 14 проц. заданьня

За дзьве дэкады студзеня плян мабілізацыі сродкаў на Гомелі выкананы на 50 проц., а на раёне—на 14 проц.

Невыкананьне плянаў мабілізацыі сродкаў зьяўляецца вынікам шчэрстай бязьдзейнасьці, недаацэнкі палітычнага значэньня кампаніі раённымі арганізацыямі.

Уся работа па мабілізацыі сродкаў праводзіцца габінетным парадкам. Грамадзкасьць ня прыцягнута да ўдзелу ў мабілізацыі сродкаў. Праф. і камсамольскія арганізацыі на сёньняшні дзень нічога канкрэтнага не зрабілі, каб пасунуць наперад справу мабілізацыі сродкаў. Гарсавет і яго сэкцыі гэтай справай зусім не займаюцца. Камісіі сацыйнасьці ператварыліся ў камісіі бязьдзейнасьці з тэй прычыны, што яны пакінуты на волю хваль без кіраўніцтва і дапамогі.

Нас вельмі дзівіць упартае маўчаньне гарКК-РСІ, якая да гэтага часу не прыняла цер у адносінах да пікавалых у невыкананьні плянаў мабілізацыі сродкаў.

А. Б.

ДАБІЦЦА ПЕРАЛОМУ

Свячасова выканаць пастанову ўраду аб адназразовым зборы

Для ажыцьцяўленьня пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуецца вялізарная напружанасьць сіл і сродкаў пролетарыяту і ўсіх працоўных мас гораду і вёскі.

Асьцягваньні на гаспадарчае і культурнае будаўніцтва ўзрастаюць з кожным толам. Але гэтых сродкаў мала.

Калектыўная мысль рабочае клясы паказала на новыя крыніцы даходаў, гэта адназразовы збор на культурнае і гаспадарчае будаўніцтва ў сельскіх раёнах.

Урад, вынесячы пастанову аб гэтым зборы, усе сродкі накідае непасрэдна ў мясцовых бюджэтах райвыканкомаў і сельсаветаў.

Для таго, каб гэты збор паступіў свячасова, неабходна весьці шырокую растлумачальную работу сярод шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў: трэба мабілізаваць увагу партыйных, савецкіх і прафесыянальных арганізацый вакол гэтай важнейшай пастановы ўраду.

Між тым ужо зараз мы маем недапушчальнае зьявішча: напа 25 проц. раёнаў БССР да гэтага часу нават не пакпапаціліся паведаміць у Наркамфін, што імі ужыта для рэалізацыі пастановы аб адназразовым зборы.

Такія апартуністычныя адносіны да справы з боку мясцовых работнікаў патурацць кулаку, спрыяюць кулацкай агітацыі супроць збору.

Трэба дабіцца рашучага пералому ў гэтай справе.

Трэба неадкладна кінуць максімум сіл на ліквідацыю прарываў у рэалізацыі пастановы ўраду.

Апартуністычныя адносіны да гэтай важнейшай кампаніі павінны спаткаць самы жорсткі бальшавіцкі адпор.

МЕНСК

Пашырэньне зімовых дамоў адпачынку

ЦСПСБ прапануе галоўсаюзтраху ў тэрміновым парадку пашырыць дамы адпачынку на 150 месц шляхам павялічэньня колькасьці пожнаў у зімовых дамах адпачынку: у Воршы—на 30, у Бабруйску—15, Магілеве—15, Гомелі—60 і Ждановічах—30. Летнія і зімовыя перапынкі ў дамах адпачынку скарачаюцца. Галоўсаюзтраху і ЦП саюзаў даручана сачыць за тым, каб па пуцёўках рабочых у дамы адпачынку, санаторыі і курорты не накіроўваліся служачыя. Наркамасьветы і таварыству пралетарскага турызму прапанавана арганізаваць зімовыя экскурсіі па БССР і іншых рэспубліках Саюзу.

Гарадзкія і раённыя прамысловыя камбінаты

Для непасрэднага кіраваньня прамысловымі прадпрыемствамі РВК і гарадзкіх саветаў арганізуюцца раённыя прамысловыя камбінаты, а ў гарадох: Менску, Віцебску і Гомелі—гарадзкія прамысловыя камбінаты. Камбінаты працуюць на гаспадарчым разрахунку і падпарадкоўваюцца непасрэдна РВК і гарадзкім саветам.

Камунальныя прадпрыемствы РВК і гарадзкіх саветаў (электра-станцыі, водаправоды, бойні, пральні, лазьні і інш.) не ўваходзяць у склад прамысловых камбінатаў.

За дзень

— У Менску адбылася першая Усебеларуская канфэрэнцыя ўдарнікаў капарацыі шкіляду. Канфэрэнцыя паслала прывітаньне ЦК партыі. У фонд набудовы дырыжабля «Клім Варашылаў» сабрана сярод дэлегатаў 70 руб.

— Цэнтральны Савет Асоавіяхіму БССР за апошні час накіраваў у лётныя школы 50 чал.—членаў Асоавіяхіму.

— Ва бестаспадарчасьць і нядбайнасьць зьняты з работы загадчык дому адпачынку «Кленкі», Гомельскага раёну.

— У бліжэйшы час у Менску скліканна канфэрэнцыя работнікаў заводзкіх лябараторый- навукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці. Абвестка для канфэрэнцыі наступная: плян работы навукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці, аб навуковай мэтодыцы лябараторнай работы фабрычна-заводзкіх лябараторый, аб ролі і ўдзеле лябараторый у барацьбе за якасьць прадукцыі і інш.

— Прэзыдыум гарсавету даручыў камгасу адвесьці вучастак на Ленінскай вуліцы для набудовы новага вучэбнага корпусу камуністычнага універсытэту Беларусі імя Леніна.

— Гарсавет зацьвердзіў наступныя нормы забесьпячэньня прадуктамі насельніцтва гародніны на 1931 г.: бульбы—175 кгр. на едака, іншай гародніны —120 кгр.

— 2-га лютага ў клюбе дрэваапрацоўшчыкаў адбыўся вечар Асоавіяхіму, прысьвечаны ролі хэміі ў будучай вайне. Паслана прывітальная тэлеграма тав. Варашылаву.

— У красавіку пачынцца работы па скончэньні будаўніцтва тэлефоннай аўтаматычнай станцыі.

Пазадзямленьні

СЕНЬНЯ:

— **Менгарком.** Роўна ў 12 гадз. скліканна парада ўсіх сакратароў партканлектываў і ячэек: Камвуз, Пэдфак, Наргас, Хэмінстытут, Будінстытут, Мэдінстытут, Саўбуд, Рабфак, Ведпэдтэхнікум, Політэхнікум, СНК, Беллартранспарт, ЦВК, Наркамасьветы. Яўка абавязкова і без спазьненьня.

— **Гарсавет Асоавіяхіму.** 5-га лютага г. г. у 8 гадз. вечара, у памяшканьні Дзяржтэатру адбудзецца вечар, прысьвечаны 50-цігодзьдзю т. Кліма Варашылава, арганізуемы гарсаветам Асоавіяхіму сумесна з гаркомам ЛКСМБ.

Білеты для яч. Асоавіяхіму выдаюцца ў гарсавеце Асоавіяхіму, а для яч. КСМ — у гаркоме камсамолу.

— **ЦК МОПР'у.** У 19 гадз. — пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у. З прычыны важнасьці пытаньняў, прысутнасьць усіх членаў прэзыдыуму і членаў і кандыдатаў ЦК, якія пражываюць у г. Менску абавязкова. Запрашаецца актыў. Фракцыя ў 6 гадз.

— **Таварыства аканамістаў - марксыстаў і аграрнікаў - марксыстаў.** У 19 г., у пам. Дзяржпляну (плян Волі, № 6, ленкуток) адбудзецца аб'яднаны сход членаў т-ва аканамістаў-марксыстаў і аграрнікаў-марксыстаў, па пытаньні аб давыбарах акадэмікаў у Беларускую Акадэмію Навук. Сход фракцыі т-ваў там-жа ў 6 гадз. Яўка членаў т-ваў абавязкова. Запрашаюцца гаспадарнікі, аканамісты, студэнцтва і аспіранты.

— **Дом Працасьветы.** У 19 гадз. сакуа працасьветы разам з надпэфнай вайсковай часткай арганізуе вечар Чырвонай армії, прысьвечаны 50-гадоваму юбілею тав. Варашылава. Праграма вечару: 1) Уральская частка. 2) Мастацкая частка. Уваход для членаў саюзу працасьветы на членскіх білетах.

— **БАН.** У 19 гадз. у пам. катэдры марксызму і ленінізму (пак. 15) адбудзецца прэнт спрэчак па дакладу т. Арэтуніянца на тэму: «Да пастаноўкі праблемы «Плеханаў — Ленін» у сувязі з новай філёзофскай дыскусыяй». Уваход вольны.

— **Дом Пісьменьніка.** У 19 гадз. — чарговая зьнятка рабочай літаратурнай студыі БелАПП'у. Яўка ўсіх членаў студыі абавязкова.

— **Дом Пісьменьніка.** У 20 гадз. адбудзецца творчы вечар БелАПП'у. Чытаюць: З. Астапенка — Новыя вершы. А. Куляшоў — Крыўда (паэма). Ю. Таўбін — Экзамэн (вянок вершаў). Запрашаюцца члены літгурткоў БелАПП'у, пісьменьнікі, пастаўнікі. Уваход вольны.

ЗАЎТРА:

— **Дом Камасьветы.** У 18 з пал. гадз. (пакой № 19, уваход з вул. Энгельса), адбудзецца групавая кансультацыя для сэкцярэў росту партканлектываў і ячэек. Парадак дня: 1) Рэгуляваньне сацыяльнага складу партыі і задачы сэкцярэў у галіне ўцягненьня рабочых у партыю і работа з кандыдатамі. Яўка ўсіх загалчыкаў сэкцярэў у абавязковым парадку.

У 19 гадз. — групавая кансультацыя для прапагандыстаў вайсковых палітшкол — «Шляхі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі». У 10 гадз. раніцы — семінары рабочых прапагандыстаў.

— **ЦСПСБ.** У 14 гадз. у пам. № 7 (паверх) скліканна парада ўсіх дамахвотнікаў культ сэктару ЦСПСБ, пытаньні аб удзеле ў штурме лікбезу і ўсеагульнага навучаньня. Яўка абавязкова.

— **Культпроп ЦК КП(б)Б** паведамляе, што члены партыі, якія жадаюць паехаць на вучобу ў Інстытут Асьпірантуры Усесаюзнай Акадэміі с.-г. Навук імя Леніна павінны падаваць заявы ў Культпроп. Умовы набору апублікаваны ў «Правде» ад 24 сьнежня 1930 г.

— **Культпроп Менгаркому КП(б)Б** паведамляе, што з 5 па 10 лютага ў 6 гадз. веч. па Інтэрнацыянальнай вул. у пам. 1-й сямігодкі (2-гі паверх) адбудзецца прыём у першапачатковую партыйную школу новага набору настаўных прадпрыемстваў і ўстаноў:

5 лютага, у 6 гадз. веч.: зав. «Ударнік», шчап. ф-ка, шчот ф-ка, сав. А.», зав. «Пралетары». ф-ка «Камунар», скарн. ф-ка шпалер. ф. «Уціль», п-к, радакцыі, ф-ка рымар. Гаражылсаюз, Аўтакір., [illegible] харч., стал. МЦРК.

6 лютага, у 6 гадз. веч: Зав. «Чырвоная Зорка», малочн. зав., Хладабойня, абуткамбінат, Сьпіртазавод, каўб. ф-ка, Хлебфармзав., зав. «Чырв. хэмік», ф-на і Крупскай, УМТ, грузчыкі, лямп. ф-ка, пал. мер і вагі, Белсамірамсаюз.

9 лютага, у 6 гадз. веч. НКЗ, НКВД, НКА, НКГ, ВСНГБ, ЦВК і СНК, Дзяржплян, н.-к. міліцыі, Беддартрэст, Абкатрэст, Лесбел, БНГ, УЭА, Гарсавет, Наксувязь, Маталяўстановы, гар. КСГУ.

9 лютага, у 6 гадз. веч.: БДВ., Прасьвяс., БАН, НД, паліклініка, 1-я сан. больн., 2-я сан. больн., Аксакаўстановы, БСТ, Выд. РСФСР, саюз Трансп., НКВД, НКЮ, Белпалпедсаюз, Белкамасцэнтр.

10 лютага, у 6 гадз. веч.: БКС, МЦРК, Дзяржбанк, Аднакласа, ЦКК РСДРП, БСІКА, скурсындыкат, графіч., Сіраміка, дом. ДПУ, ВОХР, Ваенвед, ЦК КП(б)Б.

Пералічаныя прадпрыемствы і ўстановы павінны свячасова выслаць сваіх прадстаўнікоў са сьпісамі да загадчыка школы т. Вуцілава.

6-га лютага, роўна у 6 гадзін вечара, у залі пасяджэньняў Менгаркома КП(б)Б (3-ці паверх), скліканна парада ўсіх прапагандыстаў і выкладчыкаў політэкамінімуму-адукацыйных прадметаў, занятых як у гарадзкой вячэрняй сацыяльнай школе, адвінай партыйнай школе, так і ў гурткох на прадпрыемствах. Яўка абавязкова і без спазьненьня.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і сакратарыят Менск, Савецкая, 23.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-90	Начны рэдактар	4-47
Сакратар	10-14	Галоўная кантора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел пашыкі	7-31
		Сэктар абвестак	7-81

Умовы падпіскі:

з дэрэвным дадаткам „Пра раўк"	
На 1 мес.	— 1 р
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Гадовіна прыймецца ўсюды на месцах.

Плата за абвесткі:

За радок тэксту, вісьля тэксту 1 к., чыстая гарадзкія абвесткі—6 к. за радок. Інтэрвэнтэксту—у два разы дарожэй. Разлікавальны рахунак выдавецтва № 52100321 у Дзяржбанку.

Адносіны прымаюцца ў кантору выдавецтва „ЗЬВЯЗДЫ" Менск, Савецкая 23. Рэдакцыя гад. 7-11.

ЧАЦЬВЕР, 5 лютага заказ для ГК ЛКСМБ і Асоавіяхіму. Пачатак у 8 г.

Беларускі дзяржаўны тэатр. В. Кіршон. РЭЙКІ ГУДУЦЬ. Пьеса ў 5 дзеях. 9 абразох.

ІЗКАГЫ ПІО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ГОРКА". Новы настаўны фільм выварочаньні „Саюзкіно" АМЗРЫКАНКА кіно-эпапея ў 6 частках сэрыі „Саюзкіно" № 78. Пачатак сэансаў: 1 г., 4 г. 45 м., 10 г. 30 м. Касы адчыняцца з 1 гадз. веч.

Кіно-тэатр „ГУЛЬЧУ". ВЕЛІКАЕ КАНЦЭРТНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ. Арк. Мясн. Мюзік-Холла. М. і Дасіна, Эм. ль Кенпэр. 2 Жэрэ — новы репэртуар новы фільм сэзону ІГДЗНБУ. Пач. сэансаў у 7 г., 8 г., 40 м., 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз.

КІНО „ІКТЭНДРЫЯКАЯ". З прычыны ск. ікта кось пеку, 2-гі тыдзень РУБІКОН драма ў 7 частках. Пачатак 1-го сэансу—6 гадз. Каса з 4 гадз. 30 м.

КІНО „ГАЛІЧАНЫ". І остаўкі фільм паводле [illegible] Лейкіна МАБУЛ (Крывавы поп). Дэ ма ў 9 частках. Штодзенна 4 сэансы. І сэанс 1 с. у 6 г. Каса адкрыта з 4 гадз.

КІНО „НОВЫ ПІЕНЕР". Новы дзіцячы фільм выварочаньні ВУФКУ ГАЗЭТЧЫКІ кіно-фільм у 6 частках. Пачатак сэансу у 1 гадз. дня. Каса адчыняецца з 12 гадз. дня.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗІРКА". Бальшэ Барацьба гігантаў драма ў 10 частках. Пачатак сэансу: 1 с.—7 г., 2 с.—9 г., 3 с.—11 г. Каса—з 5 гадзін.

Рабочы тэатр—студыя ЦСПСБ прыводзіць НАБОР СТУДЫЙЦАЎ. Прымаюцца пераважна рабочыя-ўдзельнікі мастацкіх гурткоў, клюбаў і прадпрыемстваў. Да заявы абавязкова прыляжыць даведку аб сацыяльным стаўленьні, месцы працы і аб стане здароўя. Першы іспыт пачнецца 8-II—31 г. у 7 гадз. вечара ў памяшканьні Культсэктару ЦСПСБ. Дырэкцыя тэатру.

НК АХОВЫ ЗДАРОЎЯ ЗАПРАШАЕ НА ПРАЦУ ў розныя месцы Бела усі СЯРЭДНІ МЭДПЭРСАНАЛ сясьцёр, разных і школьных фэльчароў і іншых. Для тых, якія маюць значны перарыў у працы па спэцыяльнасьці, будуць арганізаваны кароткатэрміновыя курсы. Пачатак заняў да 1 сакавіка. За [illegible] даведкамі па гэтым пытаньні звяртацца ў НК Аховы Здароўя.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ ДА 50-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ ТАВ. ВАРАШЫЛАВА ВЫЙШЛІ З ДРУКУ: ВЛТАЙСКІ. ВАРАШЫЛАЎ. ВАРАШЫЛАЎ (ПАЗМА) Стар. 152. Цана 1 р. 10 к. Сталін і Чырвоная армія Стар. 44. Цана 10 к. Продаж у ўвараецца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і крамах спажывецкай кааперацыі.

Да ўсіх зіцца да ведама ўсіх тавярышоў, выбраных членамі і кандыдатамі Менгарсавету X і скліканьня, ШТО ЗА АТРЫМАНЬНЕМ МАНДАТАЎ яны, пачынаючы з 5 лютага г. г., могуць зьявіцца ў памяшканьні гарадзкога савету (3-ці паверх пакой № 8) штодзенна з 10 гадз. раніцы да 15 гадз. дня і вэчарам з 19 да 21 гадз., маючы пры сабе запоўненыя анкеты (кал апошнія ўжо не адасланы ў гарадзкі савет).

Усе упаўнаважаныя ЖК, ФК, МК, якія да гэтага часу яш прысылалі ў гарсавет пратаколы выбораў і залаткаў, адзеных да вакану, павінны бязадкладна дослаць іх у гарсавет.

Гарадзкая выбарчая камісія.

Назукова-Дасьледч. Інстытуту Сьвінагадоўлі ў г. Менску ПАТРЭБНЫ: ВЭТ. УРАЧ. ТЭХНІК-БУДАЎНІК. Тэхнік-машыназнаўца, перакладчыкі з ангельскае і нямецкае мовы. АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ. Заявы падаваць да 15 лютага 1931 г., па адрасе: Менск, Шырокая 28, Інстытут Сьвінагадоўлі.

З 16-II—1931 г. пры Беларускім Кіраўніцтве Сувязі (г. Менск) АДКРЫВАЮЦЦА ВЯЧЭРНІЯ СЯМІМЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ па падрыхтоўцы ў тэхнікум сувязі. Для паступаючых патрабуюцца веды 6-ці клясаў сямігодкі. У першую чаргу прымаюцца рабочыя, дзеці рабочых, батракі, сераднякі і калгасьнікі—узрост ад 16-ці да 30 гад. При заявах павінны быць прадстаўлены дакументы: даведка аб узросьце, здароўі, сацыяльным становішчы і месцы працы. Заявы накіроўваць да 10-II г. г.: Менск, Ленінская, 36, Беларускіраўніцтва Сувязі. Беларускіраўніцтва Сувязі.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца да 2 гадз. дня

Гр. Бухман Залман Нахмаш аў змяняе свае імя і імя па бацьку (Сол. Хаіманаў) на БУХМАН САЛАМОН АЕУШЭЎ. Асоб, якія маюць прэтэнзіі да зьмены імя і імя па бацьку, просяць паведаміць у ЗАГС Рэчыцкага раёну.

ШУКАЮ ДАЧКУ ГАНЭЛЬ ВА ІЦЬЛЕВУ ДУНЕЦ, 25 г. Прошу асоб, хто ведае ее месца знаходжаньня, паведаміць па адрасе: ст. Калодзішы, Вярхы, Дуней.

ЗГУБЛЕНЫ дамовы квіты аступных лекцый ЖАКТу № 7: 1) Новаскоўская, д. № 28, 2) Рэспубліканскі завул. д. № 3, 3) Інтэрнацыянальная д. № 34. Лічыць анулёванымі.

Кошт публікацыі 1 р аб ягубе 1 дакумэнту

СЕНЬНЯ, 5-га лютага, у 7 гадзіне вечара, у галоўным корпусе Беларускага політэхнікуму, пакой 302, адбудзецца — АГУЛЬНЫ СХОД — Т-ВА МАГІЛЁЎСКУ-ДЗЯРЖУНІКАЎ У ПАРАДКУ ДНЯ—даклад прадстаўніка Камакадэміі тав. Кузьміна на тэму: «Вынікі Першага Усесаюзн. Зьезду марксыстаў—работнікаў у галіне сацыялістабудаўніцтва, дзяржавы і права». ПРАЎЛЕНЬНЕ ТАВАРЫСТВА.

6 і 11 лютага адбудуцца АГУЛЬНЫЯ СХОДЫ утрымацаў рабочых швэйнай фабрыкі „Кастрычнік" у чырвоным кутку ф-кі (Ленінская № 17) у 6 гадз. вечара. 6-II—1, 3 і 5 груп. 11-II—2 і 4 груп. Парадак дня—выбары ў гарсавет. Просьба да ўсіх утрымацаў наведаць сходы.

ПСЫХА-НЭУРАЛЁГІЧНЫ ДЫСПАНСЭР пры Д. І. Ф. О. і Н. (вул. Валадарскага, д. 16) — ПАВЕДАМЛЯЕ, — што наступны набор хворых на курсы па лячэньні заікання пры дыспансеры адбудзецца з 10 і 11 лютага г. г. Прыём правядзіцца выключна з хворых г. Менску. Прыём інвэнгарных часова спынен. Пачатак заняткаў наступнай групы 15-II-31 г. Мясцовыя хворыя, якія у свой час прайшлі курс лячэньня ад заікання у дыспансеры, запрашаюцца для праверкі гутаркі на паўторныя заняткі 12, 13 і 14 лютага у 5 гадз. вечара. Заг. дыспансеру С. АФОНСКІ.

Менскі Тарфяны Тэхнікум — КУПІЛЯЕ — мізэліры, тэадаліты, ганіамэтры, сталёвыя меркія лянты (саженныя і метрычныя). З прапановамі зварочвацца: — Зямляробскі заў. № 4, Хэмка-Тэхналягічны Інстытут, нізкі паверх.

МАШЫНІСТКА, якая добра ведае беларускую мову, ПАТРАБУЕЦЦА рэдакцыі газэты „ЗЬВЯЗДЫ". Зварочвацца да сакратара рэдакцыі з 9 да 5 гадз. штодзенна.

Белрадыёцэнтру ПАТРАБУЕЦЦА МАШЫНІСТКА, якая добра ведае беларускую мову. Аплата на месцы.

БЕЛТОРФУ (Менск, Рэвалюцыйная № 9) ПАТРЭБНЫ старшыя бухгальтары і рахункаводы.

НАРКАМПРАЦЫ БССР на працягу 24 гадзін ПРАПАНУЕ ЗРАБІЦЬ УСЕ РАЗЬЛІКІ з ніжэйпазанымі БЫЛЫМІ РАБОТНІКАМІ ЧЫГУНКІ і накіраваць у распараджэньне начальнікаў эксплёатацыйных раёнаў. Начальнікам адпаведных станцый па ўмоўленасьці з упаўнаважаным НК Шляхоў Зносін пры СНК БССР н абходна забясьпечыць праездам гэтых работнікаў да цэнтру эксплёатацыйнага раёну для паверачных іспытаў.

Сьпіс машыністаў і іх памочнікаў і кандуктораў, якія павінны быць накіраваны на транспарт.

ПРОЗЬВІШЧА, ІМЯ І ІМЯ ПА БАЦЬКУ	Прафесія	Адкуль адмяецца	Куды накіроўваецца на транспарт
Скок К. Н.	машыніст	Белкавасаюз	Гомель—Н-6
Клімовіч І. П.	»	МЦРК	Менск, Дэпо
Ізакевіч І. Р.	»	заг. мех. камгасу	» »
Сой І. Ц.	»	старш. Менскай арц. інвал. № 3	» »
Верыга А. Я.	»	Менсудтрэст	Ворша—Н-3
Аўсарэў І.	»	нарсуддзела г. Полацку	Віцебск—Н-6
Макарэў.	»	Белбюро чыгунак	Ворша—Н-3
Бязбочэў.	»	Торфавод Белторфаб'яднаньне	Ворша—Н-3
Місюкоў І.	»	Гомсельмаш	Гомель—Н-6
Шальгоўскі П. П.	»	Магвалакнабуд	Жлобін—Н-7
Сінакоў.	»	»	» »
Жульгоўскі І. П.	»	»	» »
Струноўіч.	»	»	» »
Буланаў П.	»	Магілёўскі ЦРК	» »
Барысаў М.	»	вайсупаўнаважаны Магіл. ЦРК	» »
Рамановіч М. Я.	пам. машыніста	заг. гаспадарк. школы МАПШ	Менск, Дэпо
Шатрун А. З.	»	НКГандлю	» »
Бакун Я. Н.	машыніст	махаз. майстэрня, г. Ворша	Ворша—Н-3
Новікат.	пам. машыніста	Аршанскі элеватар	» »
Слаўцкі В. В.	»	Аршанскі ЦРК	» »
Мартуцевіч Л.	машыніст	Аршанскі ЦРК	» »
Памядка Ю.	»	Мясакамбінат—Ворша	» »
Мацюшэйка.	»	зав. «Чырв. Кастрычнік»—Ворша	» »
Кобек А. Я.	»	гор. Клімавічы	Гомель—Н-6
Крайнік М. Л.	пам. машыніста	гор. Клімавічы	» »
Ермаловіч Ф. Я.	пам. машыніста	ст. інспэктар НКПВ	Ворша—Н-3
Зінковіч М. В.	»	ВСНГБ	Жлобін—Н-7
Андрэеў В. А.	»	пам. дырэктара Белдзяржсаюзбуд	Віцебск—Н-6
Апалька.	»	Магвалакнабуд	Жлобін—Н-7
Шкляр Т. Б.	машыніст	пам. дырэктара Белрыбы	Віцебск—Н-6
Чайка М. Я.	пам. машыніста	Белільнасаюз	Ворша—Н-3
Жмойдзік У. Я.	»	кіраўнік Цеплосан. тэх. буду	Гомель—Н-6
Сьпеваковіч.	»	старшыня БСІКа	Менск, Дэпо
Барановіч.	»	нарсуддзела Полацкага раёну	Віцебск—Н-6
Шымановіч Я. Я.	»	зав. «Ударнік»	Менск, Дэпо
Герасімовіч.	»	НК Асьветы	Ворша—Н-3
Кавалёў.	»	Гомсельмаш	Гомель—Н-6

КАНДУКТАРЫ:

Пікула С. Г.	галоўны кандук.	заг. сталовай № 36	Менск, а-ку станц.
Сафраненка Г. Ю.	»	заг. сталовай № 3	» »
Дунцічаў У. Е.	ст. кандуктар	інструктар МЦРК	» »
Клычаў К. С.	гал. кандуктар	ЖАКТ № 19	Ворша а-ку
Шарай Ф. Д.	кандуктар	Дзесятнік нагельні	Ворша—Н-3
Баранаў А.	гал. кандуктар	Аршанскі ЦРК	» »
Пычэнка Я.	старшы кандуктар	Аршанскі ЦРК	Жлобін—Н-7
Пескуновіч С.	шарадч. канд. брыг.	Магілёўскі ЦРК	» »
Сьмяхноў А.	ст. кандуктар	Магілёўскі ЦРК	» »
Прасольны Д.	» »	гарбарня імя Сталіна, Магілёў	» »
Лавяк Ф.	кандуктар	Валакнабуд, Магілёў	» »
Міхлевіч.	»	» »	» »
Стрэл А.	ст. кандуктар	Магілёў—Саюзхлеб	» »
Сьвічанка.	кандуктар	хлебазавод, Магілёў	» »
Дзеранягін.	»	хлебазавод, Магілёў	» »
Шкель С.	ст. кандуктар	гарбарня, імя Сталіна	» »
Крышчановіч.	кандуктар	ф-ка «Акцябр», Менск	» »
Тарасік.	галоўны кандуктар	Менск, Трансспартрэст	Ворша—Н-3

УВАГА: На паверачныя іспыты пасылаюцца выключна машыністы і іх памочнікі.

Нам. Наркампрацы БССР ЗАХАРАЎ. Ст. Інспэктар САКОЛЬЧЫК.

Менск, друкарня «ЗЬВЯЗДЫ».